Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

12 ЛЮТАГА 2016 г. ПЯТНІЦА № 27 (28137) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Што набыць на кніжным кірмашы**

СТАР. 3



**Упрыгожанні з надкрылаў насякомых**

СТАР. 16



**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

# ТРАЙНОЕ ШЧАСЦЕ



Фота БЕЛТА.

**Першая ў 2016 годзе трайня з'явілася на свет у Гродзенскім абласным перынатальным цэнтры. Два сыны і дачка нарадзіліся ў сям'і Вольгі і Андрэя Вераб'ёў. Першым на свет з'явіўся хлопчык, следам — дзяўчынка, а затым яшчэ адзін хлопчык. Імёны сваім дзеткам бацькі выбралі яшчэ да іх з'яўлення на свет: Макар, Арына і Мікіта.**

**На здымку: Вольга ВЕРАБЕЙ і намеснік галоўнага ўрача па медыцынскай часці Гродзенскага абласнога перынатальнага цэнтра Людміла КЕДА.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Марыяна ШЧОТКІНА, міністр працы і сацыяльнай абароны:**

*«Дзяржава не павінна быць манапалістам на рынку сацыяльных паслуг. Нам трэба выкарыстоўваць новы рэсурс — ініцыятыву грамадзянскай супольнасці, у тым ліку арганізацый недзяржаўнага сектара. Іх альянс з мясцовымі органамі ўлады дапаможа прыцягнуць у сістэму дадатковыя матэрыяльныя і чалавечыя рэсурсы, сфарміраваць рынак паслуг на аснове дзяржаўна-прыватнага партнёрства. Перш за ўсё — у стварэнні камфартабельных шматпрофільных пансіянатаў для ўсіх пажылых грамадзян, не толькі адзінокіх. Хоць роля ўядучага арганізатара інавацыйных формаў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва ёсць і заўсёды будзе прэрагатывай дзяржавы».*

■ Спецыяльны рэпартаж

## З ГАЗАМ ЛЕПЕЙ НЕ «ХІМІЧЫЦЬ»

### Разам са спецыялістамі карэспандэнты «Звязды» праверылі газавае абсталяванне ў жылых дамах

**Пасля выпадку ў Барысаве, калі ад атручвання чадным газам загінула шэсць чалавек, арганізацыя «Белпалівагаз» вырашыла правесці пазапланавую праверку па ўсёй краіне. Супрацоўнікі службы наведваюць кватэры шматпавярховікаў, дзе стаяць газавыя катлы і калонкі, абследуюць сістэму і нагадваюць людзям аб правілах бяспекі. Пракантралююць і прыватны сектар. Да адной з такіх праверак у Дзяржынскім раёне далучыліся карэспандэнты «Звязды».**

СТАР. 4



Фота Надзеі БУЖАН.

**Апазнавальныя прыкметы газаўшчыкоў — форма і бэйджык з прозвішчам.**

■ Надвор'е

## АМАЛЬ САКАВІК

### Уначы галалёдзіца, а ўдзень — да 6 цяпла

**У пятніцу на тэрыторыі Беларусі будуць гаспадарыць няўстойлівыя паветраныя масы, якія паступаюць да нас з боку Заходняй Еўропы. Чакаецца воблачна з праясненнямі, максімальная тэмпература паветра — ад 0 да плюс 6 градусаў, паведамілі спецыялісты Беларускага гідраметцэнтра.**

У суботу на тэрыторыю краіны завітае чарговы атмасферны фронт з боку Украіны. Таму ўначы месцамі, а ўдзень — на большай частцы краіны кароткачасовыя ападкі (мокры снег і дождж). У асобных раёнах магчымы туман, а ўначы і раніцай слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Мінімальная тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 градусаў да 2 цяпла, а максімальная ўдзень чакаецца да плюс 6 градусаў. У нядзелю часам будуць ісці мокры снег і дождж. У асобных раёнах туман, уначы і раніцай слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Уначы будзе ад мінус 2 да плюс 3 градусаў, а ўдзень чакаецца ад 0 да 6 цяпла.

Аграметэаралагічныя ўмовы для азімых пасеваў складваюцца здавальняюча, паведамляюць спецыялісты Белгідраметцэнтра. Пад уплывам незвычайна цёплага надвор'я ў першай дэкадзе лютага на большай частцы тэрыторыі краіны снег з палёў сышоў цалкам. Невялікае снежнае покрыва вышынёй ад 0,5 см да 1 см захоўваецца толькі месцамі на паўночным усходзе і ўсходзе краіны.

Сіноптыкі адзначаюць, што вельмі цёплае надвор'е спрыяе інтэнсіўнаму адтайванню глебы. На значнай частцы тэрыторыі Беларусі глеба адтала поўнасцю або адзначаецца прамярзанне не больш за 5—15 см. У паўночна-ўсходнім рэгіёне краіны глыбіня адтайвання глебы складае ад 1—5 см да 10—15 см.

Спецыялісты ўпэўнены, што і ў другой дэкадзе лютага ў сувязі з захаваннем анамальна цёплага для гэтага перыяду надвор'я адтайванне глебы працягнецца. А вось нізкіх тэмператур, якія былі б небяспечнымі для азімых пасеваў ва ўмовах адсутнасці снежнага покрыва, у бліжэйшы час не чакаецца.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 12.02.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 22034,00 | ▼ |
| Еўра | 24883,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 278,47 | ▼ |
| Укр. грыўня | 843,89 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# Абарона парушаных правоў чалавека і дзяржавы

## з'яўляецца крытэрыем ацэнкі дзейнасці Следчага камітэта

**Следчы камітэт ствараўся не для паказчыкаў, а дзеля дапамогі чалавеку. На гэты факт звярнуў увагу Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, выступаючы на пашыраным пасяджэнні калегіі ведамства.**

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на ўсеагульную салідарнасць з тым, што рашэнне аб стварэнні Следчага камітэта было правільным і абгрунтаваным. Палепшыліся паказчыкі следчай працы. «Але мы гэта рабілі не дзеля паказчыкаў. Гэта было зроблена дзеля людзей», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы арыентаваў следчых на тое, што іх задача — разгледзець ва ўстаноўлены тэрмін кожную заяву, пры наяўнасці складу злачынства неадкладна распачаць крымінальную справу, а затым яе расследаваць, збіраць доказы і шукаць вінаватых. «І не трэба следчым таксама чакаць ад аператыўнікаў нейкай гатовай крымінальнай справы, каб яе прыгожа падпісаць, падшыць або адправіць пракурору, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Памятайце, што за вашай работай стаяць простыя людзі, якія хочуць, каб іх правы былі абароненыя, а вінаватыя — пакараныя! І не толькі простыя людзі».

Пры гэтым Прэзідэнт перасцярог і ад іншай крайнасці: органы дазнання не павінны спрабаваць перадаць следству для прыняцця працэсуальных рашэнняў не да канца правераныя матэрыялы.

Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што за апошнія гады нагрузка на следчых істотна знізілася. На яго думку, гэта павінна быць выкарыстана для павышэння якасці і скарачэння тэрмінаў расследавання, а таксама для правядзення непасрэдна следчымі большай колькасці праверак па заявах пра злачынствы. У якасці прыкладу кіраўнік дзяржавы прывёў сітуацыю з крадзяжамі, дзе адзначаецца самы нізкі ўзровень раскрывальнасці. «Але як іх раскрыць, калі праверку па гарачых слядах часам праводзіць адзін участковы? Значыць, з самага пачатку ў гэтую працу трэба ўключацца следчаму, у якога больш і вопыту, і магчымасцяў», — лічыць Прэзідэнт.

«Крытэрый ацэнкі вашай дзейнасці павінен быць адзін — абарона парушаных правоў і інтарэсаў кожнага чалавека, грамадства і дзяржавы!» — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Асобна Прэзідэнт спыніўся на пытаннях забеспячэння эканамічнай бяспекі і процідзеяння злачыннасці ў гэтай сферы. На думку кіраўніка дзяржавы, праваахоўныя структуры не павінны быць перашкодай для эфектыўнай работы прадпрыемстваў і паляпшэння інвестыцыйнага клімату.

«Празмерная старанласцю мы тут не толькі не дапаможам — можам зрабіць горш, — лічыць Прэзідэнт. — Галоўнае — гэта эканоміка. Мы не павінны ва ўгоду нейкім паказчыкам і нават гучным справам «дадушыць» прадпрымальнікаў, маю на ўвазе і дзяржаўнай, і прыватнай формы ўласнасці, якія кормяць краіну».

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ён супраць прыпынення праверак. На думку Прэзідэнта, падобнае рашэнне створыць няроўныя ўмовы для функцыянавання розных суб'ектаў гаспадарання. «Мы ўжо прынялі ўсе меры для таго, каб інспектар, ідучы па вуліцы, не меў права зайсці ў ларок і па сваёй волі там пачаць яго правяраць і вытрасаць усё навыварат», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Але калі «ёсць інфармацыя, што ты ўчора адкрыў сваю справу і дапусціў правапарушэнне, — да цябе прыйдуць, цябе праверацб. Што значыць тры гады пасля адкрыцця цябе не правяраюць? Ну так у нас будуць фірмы 2,5 года працаваць, затым ліквідаваліся, пайшлі перарэгістравалася — і зноў займаюцца чым хочуць. Можа быць і такое. Таму ўсе павінны быць у роўных умовах», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Ён акцэнтаваў увагу, што сёння адным з асноўных пытанняў як Следчага камітэта, так і праваахоўнага блока ў цэлым павінна быць забеспячэнне захаванасці фінансавых і матэрыяльных рэсурсаў. Гэта задача павінна абавязкова ўлічвацца ў рабоце ўсіх праваахоўных органаў. Аляксандр Лукашэнка лічыць, што асноўныя намаганні варта засяродзіць на выяўленні і спыненні злачынстваў, якія падрываюць асновы функцыянавання беларускай эканомікі, максімальнай кампенсацыі нанесенай шкоды.

Прэзідэнт асобна спыніўся на мерах стрымання па справах аб эканамічных злачынствах. На яго думку, у праваахоўнікаў дастаткова такіх мер, як заклад, хатні арышт, паручальніцтва. «Але пры гэтым трэба мець на ўвазе, што ў нас часта бывае: сёння пад хатні арышт ці падпіску аб нявыездзе — заўтра мы шукаем яго па ўсім свеце», — перасцярог Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што па-ранейшаму пільная ўвага павінна надавацца барацьбе з карупцыяй. На яго думку, пры расследаванні такіх крымінальных спраў неабходна вельмі прынцыпова падыход не толькі ў пытаннях выкрывання злачынцаў, але і выяўлення і ліквідацыі перадумоў гэтага зла. «Пры гэтым трэба дакладна разумець: якімі б прапрыстымі ні былі ўмовы дзейнасці чыноўнікаў, якія б маральныя патрабаванні да іх ні прад'яўляліся, меры прафілактыкі таксама маюць пэўнае значэнне», — падкрэсліў Прэзідэнт, дадаўшы, што найлепшая прафілактыка — няўхільнасць пакарання карупцыянераў. Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка перакананы: самае страшнае — калі чалавек, які змагаецца з карупцыяй, сам заграз у падобных злачынствах. «Гэта здрада, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Самая дрэнная якасць чалавека». У сувязі з гэтым ён паставіў перад Следчым камітэтам задачу выкараняць у сваіх шэрагах элементы карупцыі, а таксама надаваць больш увагі маральнаму клімату ў калектыве.

Што тычыцца задач і функцый Следчага камітэта, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што да практычнага следства асаблівых прэтэнзій няма. Аднак арганізацыя астатняй работы вымушае жадаць лепшага. Прэзідэнт звярнуў увагу, што «перш за ўсё не відаць аналітычнай працы, кіраўніцкіх, заканадаўчых ініцыятыў». У той жа час Следчы камітэт валодае дастатковым кадравым патэнцыялам для гэтага, а таксама вялізным масівам інфармацыі па многіх напрамках жыццядзейнасці грамадства.

Аляксандр Лукашэнка даручыў аптымізаваць штат камітэта, скарацішы яго фінансавыя, тылавыя структуры, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы. У ліку іншых задач, якія стаяць сёння перад камітэтам, Прэзідэнт назваў наладжванне эфектыўнага працэсуальнага кантролю, які не павінен ператварацца ў інструмент застрашвання і гонкі за паказчыкамі, барацьбу з залішняй папяратворчасцю. Акрамя таго, важным з'яўляецца фарміраванне адзінай следчай практыкі для таго, каб падыходы да кваліфікацыі адных і тых жа дзеянняў ва ўсіх рэгіёнах і праваахоўных структурах былі аднолькавымі.

Падводзячы вынікі абмеркавання, кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што эфектыўнасць работы праваахоўнікаў павінна ацэньвацца па рэакцыі насельніцтва, а не па статыстыцы. «Нам не патрэбна паказуха», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён заклікаў праваахоўнікаў «проста быць народнымі людзьмі».

Пры гэтым кіраўнік дзяржавы паўтарыў сваё патрабаванне да міліцыі і іншых сілавых структур рабіць усё неабходнае для павышэння свайго іміджу ў насельніцтва, каб падабацца людзям, хоць гэта і няпроста. Прэзідэнт запатрабаваў, ужываючы ўсе формы і метады, даказваць, што праваахоўнікі носяць пагоны, каб абараняць людзей.

---

■ Блізкая ўлада

# ПРЫВАТНІК КЛІЕНТАЎ ПАДМАНУЎ, ГРОШАЙ НЕ ВЯРНУЎ

## Старшыня Мінаблвыканкама даручыў адпаведным службам вывучыць сітуацыю

**Як заўсёды, на чарговым выязным прыёме грамадзян, які правёў у Клецку старшыня Мінскага аблвыканкама Сямён ШАПІРА, не абышлося без зваротаў аб уладкаванні дарог.**



У прыватнасці, з просьбай пахадайнічаць у асфальтаванні вуліцы Калгасная да могілак у вёсцы Сіняўка прыйшоў жыхар раёна. Кіраўнік цэнтральнага рэгіёна запомніў гэтага наведвальніка яшчэ падчас першага прыёму: ён звяртаўся з такім жа пытаннем. Тады чарговы раз дарогу падсыпалі, уладкавалі. За яе станам адпаведныя службы сочаць і цяпер. Камісія, што напярэдадні прыёму выязджала на месца, таксама адзначыла, што дадатковага рамонту тут не патрабуецца: па ёй можна і прайсці, і праехаць. Наогул, што тычыцца ўладкавання і асфальтавання вуліц і дарог, то ў кожным раёне па даручэнні старшыні аблвыканкама складзены графік чарговасці, які надрукаваны ў мясцовых сродках масавай інфармацыі. І гэта не азначае, калі чалавек трапіў на прыём да кіраўніка вобласці, то дарога будзе заасфальтавана. У першую чаргу ўвага ўдзяляецца тым сельскім і пасялковым магістралям, якія знаходзяцца ў нездавальняючым стане.

Зварот, што называецца, зварот у розніца. На прыёме пенсіянер з вёскі Панач прасіў, каб праверылі якасць будаўніцтва жылога дома для свайго пасынка. Высветлілася, што шматдзетная сям'я пабудавала дом з дзяржаўнай падтрымкай. Затым у маладых нарадзілася чарговае немаўля. Па льготным крэдыце ўзвялі яшчэ адзін дом. Дзеці і самі не разумеюць, што хоча іх айчым. Яны нікога не прасілі за іх хадайнічаць, бо задаволены жыллёвымі ўмовамі, дзякуюць уладзе і райвыканкаму за ўвагу і падтрымку. Членам камісіі, якая выязджала да іх, каб разабрацца ў сітуацыі, муж і жонка нават перадалі пісьмо, каб яго зачыталі падчас прыёму, што і было зроблена. Сямён Шапіра запатрабаваў прыпыніць перапіску з заяўнікам.

Жыхар аднаго з шматкватэрных дамоў, што па вуліцы Савецкая ў райцэнтры, паскардзіўся, што ў кватэры холадна, тэмпература не перавышае 16 градусаў цяпла. Старшыня Клецкага райвыканкама Генадзь Салавей растлумачыў: камунальнікі неаднаразова прапаноўвалі яму нарасціць ацяпляльную батарэю. Ён нібыта не супраць. Але на справе не пускае работнікаў дамоў. Старшыня аблвыканкама прапанаваў чарговы раз накіраваць спецыялістаў па ўстаноўцы дадатковых радыятарных элементаў. Калі заяўнік не адчыніць дзверы, то скласці аб гэтым адпаведны акт. Разам з тым, як аказалася, зусім нядаўна жыллёва-камунальныя службы вычысцілі ў гэтым доме падвал ад смецця, старой, паламанай мэблі, макулатуры. Усё гэта не толькі псавала санітарную абстаноўку, але і стварала пажаранебяспечную сітуацыю.

**Дзеці і самі не разумеюць, што хоча іх айчым. Яны нікога не прасілі за іх хадайнічаць, бо задаволены жыллёвымі ўмовамі.**

Шматдзетнай сям'і, што будуе дом на вуліцы Рассветнай, прыватнае прадпрыемства няякасна ўстанавіла вокны. Гаспадары звярнуліся ў суд, які заняў іх пазіцыю і абавязаў бракаробаў выплаціць ім амаль 80 млн рублёў. Аднак судоваму выканаўцу ўдалося спагнаць з вінаватага толькі 4 млн рублёў. Вярнуць астатняе не прадстаўляецца магчымым, паколькі ў кіраўніка прыватнага ўнітарнага прадпрыемства па дакументах няма ніякай маёмасці, грашовых сродкаў. Сямён Шапіра даручыў адпаведным службам вывучыць сітуацыю, праверыць работу фірмы. І калі высветліцца, што ўладальнік вядзе незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць, прыняць неабходныя меры.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.
lazovskaya@zviazda.by

---

■ Знешняя палітыка

Уладзімір МАКЕЙ:

# «МІНСКІ ФАРМАТ» АПРАЎДАЎ СЯБЕ»

**Роўна год прайшоў з часу падпісання «мінскіх дамоўленасцяў» — калі лідары Украіны, Расіі, Францыі і Германіі сустрэліся ў нашай сталіцы, каб паспрабаваць вырашыць канфлікт на ўсходзе Украіны. Учора падчас канферэнцыі «Мінскія пагадненні праз год: дасягненні, выклікі, урокі» міністр замежных спраў нашай краіны Уладзімір МАКЕЙ пацвердзіў, што тыя леташнія перамовы апраўдалі сябе.**

«Мінскі фармат» апраўдаў сябе, і калі б усе зацікаўленыя бакі выконвалі тыя дамоўленасці, якія былі дасягнуты год таму, то, я перакананы, канфлікт на Украіне даўно ўжо быў бы спынены, — адзначыў Уладзімір Макей. — Што тычыцца пашырэння гэтага фармату, ведаеце, калі б гэта спрыяла больш хуткаму аднаўленню міру і стабільнасці ва Украіне, то, богам просім, на гэта можна было б спакойна пайсці».

Робячы ацэнку працы трохбаковай кантактнай групы па ўрэгуляванні ўкраінскага канфлікту, кіраўнік знешнепалітычнага ведамства нашай краіны прызнаўся, што складана сказаць — задаволены ён яе працай ці не. «Вядома ж, хацелася б, каб гэтая група дасягнула больш пазітыўных вынікаў, — сказаў міністр. — Але, ведаеце, калі напал страсцей велізарны, калі канфлікт дасягнуў такога высокага пункту напружання, дасягнуць імгненных поспехаў вельмі цяжка. Таму трохбаковая кантактная група робіць выдатную справу, вырашаючы пытанні хай павольна, але паступальна і ўвесь час. Я бачу, што ў яе ёсць перспектывы, і, натуральна, мы будзем аказваць усялякае садзейнічанне яе працы. Да нас часам паступаюць нейкія папрокі, што мы павінны рабіць нешта іншае, але гэта будзе азначаць наша ўмяшанне ў дзейнасць трохбаковай кантактнай групы. У іх ёсць выразны фармат, у іх ёсць свой рэгламент работы, таму мы гатовыя забяспечыць, умоўна кажучы, сакратарыяцкія, арганізацыйныя, пратакольныя функцыі, рабіць нейкае матэрыяльнае садзейнічанне рабоце трохбаковай кантактнай групы, не ўмешваючыся ў змест яе працы. Але калі нас папросяць пра нешта, мы заўсёды адгукнёмся на гэтыя просьбы».

Надзея ЮШКЕВІЧ.
yushkevich@zviazda.by

---

# ЁСЦЬ ПЫТАННЕ? ТЭЛЕФАНУЙЦЕ!

## Прамыя лініі пройдуць і ў гэтую суботу

У Беларусі арганізавана штотыднёвае правядзенне аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам прамых тэлефонных ліній у мэтах павышэння эфектыўнасці работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму і валакіты, а таксама для аператыўнага вырашэння ўзніклых у людзей праблемных пытанняў. Такая форма зносін паміж уладай і жыхарамі краіны стартавала ў студзені 2015 года і праводзіцца па суботах.

**13 лютага з 9.00 да 12.00 на званкі адкажуць:**

**Брэсцкі аблвыканкам**
першы намеснік старшыні
ТОКАР Мікалай Васільевіч
(80162213121);

**Віцебскі аблвыканкам**
першы намеснік старшыні
ГРАБНЁЎ Генадзь Іванавіч
(80212222222);

**Гомельскі аблвыканкам**
першы намеснік старшыні
МІКАЛУЦКІ Аляксандр Віктаравіч
(80232751237);

**Гродзенскі аблвыканкам**
намеснік старшыні
ДЗЯШКО Уладзімір Іосіфавіч
(80152735644);

**Магілёўскі аблвыканкам**
намеснік старшыні
НЕКРАШЭВІЧ Віктар Уладзіміравіч
(80222501869);

**Мінскі аблвыканкам**
намеснік старшыні
ПЛАЎСКІ Алег Альфрэдавіч
(80175004160);

**Мінскі гарвыканкам**
намеснік старшыні
ДАМАРАЦКІ Андрэй Уладзіміравіч
(80172224444).

# ЁСЦЬ ШТО ПАЧЫТАЦЬ!

## Якія кнігі варта пашукаць і набыць на Нацыянальным стэндзе Беларусі?

**Каб дапамагчы наведвальнікам XXIII Мінскай міжнароднай кніжнай выставы-кірмашу сарыентавацца ў бясконцым мностве кніг, прадстаўленых беларускімі выдавецтвамі на калектыўным стэндзе, мы распавядаем пра дзясятку найярчэйшых праектаў. Некаторыя з гэтых выданняў ужо сталі сапраўднымі хітамі продажаў, а некаторыя — яшчэ толькі пачынаюць свой шлях, і выстава — іх першая магчымасць сустрэцца з чытачом.**



**1.** ***Анатоль Кляшчук. Карагод беларускіх абрадаў. — Мінск: Беларусь, 2015***

Аўтар фотаздымкаў з гэтага альбома, фотакарэспандэнт «Звязды» Анатоль Кляшчук, ужо амаль тры дзесяцігоддзі падарожнічае па Беларусі, фіксуючы мясцовыя абрады, святы, традыцыі іх правядзення. Гэта не пастаноўкі, не ігра акцёраў, гэта сапраўдная Беларусь. На старонках выдання змясцілася паўнавартаснае даследаванне захаванасці традыцыйных беларускіх свят з акцэнтам на іх мясцовыя элементы. Кніга — пераможца ў намінацыі «Фотапогляд» сёлетняга конкурсу «Мастацтва кнігі».

**2.** ***Мой дзень пачынаецца. — Мінск: Мастацкая літаратура, 2015***

Можна сцвярджаць, што гэтае выданне — калектыўны партрэт беларускай літаратуры ў будучыні, такой, якой яна стане праз адно-два дзесяцігоддзі, калі сённяшнія дэбютанты «стануць на крыло» і займеюць уласны, гучны і пазнавальны голас. Больш як чатыры дзясяткі творцаў, некалькі соцень вершаў і апавяданняў. Самыя новыя імёны беларускіх паэтаў і празаікаў. Самыя свежыя творы. Самыя шчырыя жаданні і памкненні. Пад вокладкай зборніка «Мой дзень пачынаецца», у якасці укладальніка якога выступіў паэт, галоўны рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Віктар Шніп, сабраны вершы і апавяданні маладых беларускіх творцаў.

**3.** ***Анатоль Бутэвіч. Таямніцы Крэўскага замка. — Мінск: Выдавецкі дом «Звязда», 2015***

Замкавыя сцены памятаюць Гедыміна, Вітаўта і Ягайлу. Тут адбываліся падзеі, лёсавырашальныя для ўсяго Вялікага Княства Літоўскага. Таму не дзіўна, што замак у мястэчку Крэва, адзін з самых старажытных на нашых землях, і сёння прыцягвае ўвагу гісторыкаў і пісьменнікаў. Разам з князем Вітаўтам у падарожжа па мінулых стагоддзях на старонках гэтага выдання выправіўся Анатоль Бутэвіч. Каб развеяць міфы, разгадаць загадкі, а можа, загадаць чытачу новыя? Сёлета на Нацыянальным конкурсе «Мастацтва кнігі» гэтае выданне атрымала перамогу ў намінацыі «Літфармат».

**4.** ***Финансовая диета: Реформы государственных финансов Беларуси / научный редактор Кирилл Рудый. — Минск: Издательский дом «Звязда», 2016***

Кніга з вельмі сур'ёзным зместам. Перад намі — навуковая манаграфія, прысвечаная асноўным тэндэнцыям у нацыянальнай эканоміцы Рэспублікі Беларусь. Яна дапаможа зразумець, якімі рысамі вызначаюцца эканомікі, што развіваюцца, як размяркоўваюцца дзяржаўныя фінансы, як адбываецца адміністрацыйнае кіраванне. Манаграфія закранае і пытанні рэгіянальнай эканомікі, індустрыяльнай і сацыяльнай палітыкі. Таму выданне, безумоўна, будзе цікавае і карыснае студэнтам — будучым эканамістам і кіраўнікам, а таксама многім чытачам, якія імкнуцца зразумець адметнасці сучаснага эканамічнага становішча краіны.

**5.** ***Уладзімір Мулявін. Сэрцам, і думамі... — Мінск: Мастацкая літаратура, 2015***

Адна з найярчэйшых кніг мінулага года. Сапраўдны знак памяці выдатнаму музыканту, народнаму артысту СССР Уладзіміру Мулявіну. Заснавальнік легендарнага ансамбля «Песняры», ураджэнец расійскага Свярдлоўска, ён зрабіў беларускую песню вядомай ва ўсім свеце, дзякуючы яму ў песні ператвараліся і класічныя вершы Купалы, Багдановіча, Броўкі, Куляшова... Выданне, з цеплынёй і шчырасцю ўкладзенае Людмілай Крушынскай, з незвычайнай прыхільнасцю прынятае публікай. І гэта заканамерна. Гэтая кніга — калектыўная адзнака павагі і памяці сяброў і калег пра Мулявіна, але разам з тым работа вельмі асабістая і шчымлівая — для яго адданых прыхільнікаў.

**6.** ***Вольга Лабачэўская, Зінаіда Зіміна. Беларускі народны касцюм. — Мінск: Выдавецкі дом «Беларуская навука», 2015***

Мець дома традыцыйны касцюм, надзяваць яго на святы — справа гонару для прадстаўнікоў многіх народаў. У Беларусі цікавасць да традыцыйных элементаў у вопратцы — вышыўка на кашулях, тканыя паясы і спадніцы — толькі пачынае развівацца, укараніцца ў паўсядзённасць. Таму і значнасць гэтай работы доктара мастацтвазнаўства, вядомай даследчыцы традыцыйнай культуры беларусаў Вольгі Лабачэўскай неверагодная. Гэта — узор, на які варта арыентавацца. Адметна, што ў аснове кнігі — фактура, сабраная аўтаркай падчас многіх экспедыцый. Кніга змяшчае і мноства фотаздымкаў, зробленых у розных мясцовасцях краіны і ў музеях, дзе сабраны лепшыя ўзоры народнага касцюма.

**7.** ***Звонкие краски слова. — Минск: Беловагрупп; Москва: Планета, 2015***

Сумесны беларуска-расійскі праект для дзяцей, рэалізаваны па выдавецкай праграме ўрада Масквы. Пад адной вокладкай сабраныя найлепшыя дзіцячыя творы класікаў беларускай і рускай літаратуры — Якуба Коласа і Льва Талстога, Аляксея Дударава і Міхаіла Прышвіна, Максіма Багдановіча і Мікалая Носава і іншых вядомых пісьменнікаў. У апавяданнях і вершах дзейнічаюць спрытныя, разумныя, цікаўныя героі, яны смелыя і рашучыя, яны добрыя і адкрытыя. Цікава, што адмыслова для кнігі ілюстрацыі намалявалі вучні Мінскай дзяржаўнай гімназіі-каледжа мастацтваў і Маскоўскай дзяржаўнай спецыялізаванай школы акварэлі Сяргея Андрыякі.

**8.** ***Павел Місько. Прыйдзі, дзень-залацень. — Мінск: Мастацкая літаратура, 2015***

Чытаючы гэтую аповесць-казку, вашы дзеці ці ўнукі дакладна не засумуюць. Дасціпныя героі дзед Аўласка і баба Параска з традыцыйным народным гумарам распавядуць мноства гісторый, смешных, страшных, павучальных. Гэты твор напісаны вядомым пісьменнікам Паўлам Міськом ў найлепшых традыцыях беларускай дзіцячай літаратуры. Тут «жывуць» сабачкі і пеўнікі, злыя вядзьмаркі і чэрці, здараюцца самыя неверагодныя гісторыі. Гэта ж казка, усё магчыма! Кнігу аздабляюць выдатныя ілюстрацыі Галіны Хінка-Янушкевіч.

**9.** ***Таццяна Сівец. Разняволенасць. — Мінск: Выдавецкі дом «Звязда», 2016***

Зусім новы зборнік вершаў таленавітай паэткі і перакладчыцы Таццяны Сівец. Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш першай прывітала гэтае выданне: яно пабачыла свет літаральна напярэдадні форуму. «Разняволенасць» змяшчае ўласныя вершы аўтаркі, глыбока асабістыя і кранальныя, непаўторныя і непасрэдныя. А побач з імі — ці не на палову кнігі — пераклады Таццяны аўтараў з Азербайджана, Казахстана, Украіны, Расіі, Славакіі, іншых краін.

**10.** ***Алесь Суша. Францыск Скарына — чалавек-энцыклапедыя. — Мінск: Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2016***

Першая частка трохтомнага выдавецкага праекта, прысвечана асобе і спадчыне першадрукара Францыска Скарыны. Выдавец, друкар, даследчык, сакратар, перакладчык, прадпрымальнік, паэт... У гэтай энцыклапедыі для дзяцей прадстаўлена каля двух дзясяткаў іпастасяў Скарыны. Кніга, напісаная лёгкай мовай, змяшчае мноства ілюстрацый. Першапачаткова яна стваралася для дзіцячай аўдыторыі, аднак аўтар мяркуе, што выданне зацікавіць самае шырокае кола чытачоў і дапаможа спасцігнуць феномен асобы першадрукара. Наступныя часткі трохтомніка распавядуць пра біяграфію і спадчыну Скарыны.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**

# МАСТАЦКАЕ СЛОВА Ў ЭЛЕКТРОННЫМ АБЛІЧЧЫ

**Адна з заключных сустрэч у межах Міжнароднага сімпозіума «Пісьменнік і час» прайшла ў Выдавецкім доме «Звязда». Госці з розных краін пазнаёміліся з інтэрнэт-парталам «Созвучие: литература и публицистика стран СНГ».**

«Звяздоўцы» паказалі, як сайт насычаецца шматаблічнай інфармацыяй пра літаратурны працэс у краінах Садружнасці. Расказалі, з кім супрацоўнічаюць па насычэнні інтэрнэт-прасторы навінкамі мастацкай літаратуры, кнігавыдання з розных краін. Удзел у сустрэчы прыняла і казахстанскі літаратуразнаўца Святлана Ананьева.

— Мы ў Казахстане актыўна сочым за «Созвучием...» найперш таму, што шмат новага ў канцэнтраваным выглядзе даведваемся пра развіццё літаратур розных народаў на постсавецкай прасторы. Гэта цікава і літаратуразнаўцам, і ўніверсітэцкім і школьным выкладчыкам, і студэнцкай моладзі, і самім пісьменнікам, як мне падаецца. Рады, што на вашым партале вы вельмі ўважлівыя да казахскай літаратуры. Гэта і пастаяннае пашырэнне зместу старонак «Абай крочыць па планеце», «Свет Мухтара Аўэзава», і сама інтэрнэт-старонка «Літаратурны Казахстан». Такую работу іначай, як электронным літаратуразнаўчым інстытутам, і не назавеш. Вось дзе вялікай навуцы чэрпаць матэрыял для даследаванняў, для шырокага і грунтоўнага разгляду!..

Госці сімпозіума абмеркавалі, каго і як у краінах СНД далучыць да такога электроннага праекта, як пайсці далей, каб задаволіць самага патрабавальнага чытача ў электронным сецыве, каб паяднаць намаганні па знаёмстве з нацыянальнымі літаратурамі.

— Мне здаецца, што патрэбна дадаць як мага болей інтэрактыўных праектаў, — вынес прапанову галоўны рэдактар часопіса «Нёман» Аляксей Чарота. — Думаю, што мы маглі б правесці шэраг віртуальных «круглых сталоў» па розных праблемах мастацкага перакладу, літаратурных сувязяў і іншых творчых абсягах. Не хапае на «Созвучии...» і форуму.

Дарэчы, Выдавецкі дом «Звязда» ў час сімпозіума падпісаў шэраг дамоў з замежнымі гасцямі аб электронным абмене кнігамі, інфармацыяй пра нацыянальныя літаратуры розных краін.

**Сяргей ШЫЧКО.**

# ПАЧУЦЬ МУЗЫКУ ЧАСУ

## Прынята рэзалюцыя II Міжнароднага сімпозіума «Пісьменнік і час: пераемнасць пакаленняў»

**Пісьменнікі — людзі асаблівыя. Яны больш засяроджаны на сабе, іх погляд, скіроўваючыся ў сучаснасць, выбірае напрамак з улікам культурнай гісторыі народа. Каб пісаць, яны мусяць шмат чытаць. Каб стварыць мелодыку ўласнага твора — прыслухоўвацца да музыкі часу. Напэўна, таму творцам з розных краін так лёгка паразумецца, знайсці агульную мову і наладзіць плённае супрацоўніцтва.**




Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Яшчэ адным доказам гэтаму стала рэзалюцыя, прынятая ўчора ў Мінску паэтамі, празаікамі, перакладчыкамі з 14 краін свету падчас пленарнага пасяджэння сімпозіума «Пісьменнік і час: пераемнасць пакаленняў». У гэтым агульным рашэнні творцаў — акцэнт на важнасць літаратуры і чытання, спадзяванне на новыя плённыя праекты і ініцыятывы, удзячнасць кіраўніцтву дзяржавы і арганізатарам выставы-кірмашу за магчымасць сабрацца разам.

«Пісьменнікі, як і ўсе прадстаўнікі культуры і мастацтва, павінны ў XXI стагоддзі рабіць намнога больш для ўзаемадзеяння літаратур і даваць хоць нейкія шанцы выходзіць на сусветны рынак кнігам на ўсіх мовах. У адзінстве і пераемнасці пакаленняў — наша сіла, яна дазваляе адказваць на негатыўныя выклікі сучаснасці, супрацьстаяць глабальнай бесчалавечнасці», — гаворыцца ў рэзалюцыі.

І сапраўды, роля міжнароднай супольнасці сёння надзвычай высокая ў розных галінах жыцця грамадства. Так, год таму Мінск быў вялікай пляцоўкай важных перамоў, тут вырашаліся пытанні палітыкі вайны і міру. І ў гэты ж час пісьменнікі з розных краін казалі пра істотную ролю слова творцы ў грамадстве.

— І сёлета мы натхніліся прывітальным словам кіраўніка дзяржавы ўдзельнікам Мінскай міжнароднай кніжнай выставы-кірмашу і сімпозіума пісьменнікаў пра тое, што форум будзе садзейнічаць папулярызацыі якасных і змястоўных літаратурных твораў, прапагандзе кнігі ў маладзёжным асяродку, наладжванню ўзаемных кантактаў і развіццю міжнароднага гуманітарнага супрацоўніцтва, — падкрэсліла **міністр інфармацыі Беларусі Лілія АНАНІЧ**. — Таму мы імкнёмся працягнуць шматбаковае супрацоўніцтва, рэалізоўваць новыя перакладныя праекты. Вельмі сімвалічна, што сёлета мы звярнулі ўвагу на пераемнасць у літаратуры. Важна, што маладыя таленты атрымалі магчымасць у фармаце жывых творчых зносін з вядомымі аўтарамі актуалізаваць творчы і жыццёвы вопыт.

Сучаснасць ставіць перад творцамі шмат пытанняў, задач, якія могуць падацца невырашальнымі. Але па меркаванні **старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалая ЧАРГІНЦА**, аўтарам варта забыцца на сціпласць, не баяцца казаць гучныя словы, прымаць смелыя рашэнні — калі іх намеры шчырыя, справядлівыя, а рашэнні — карысныя для ўсяго грамадства. Але большая верагоднасць, што гэтыя словы пачуюць, — калі яны прагучаць мноствам галасоў творцаў з розных краін свету.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**

# З ГАЗАМ ЛЕПЕЙ НЕ «ХІМІЧЫЦЬ»

## «ЛЕПШ ЭЛЕКТРАНАГРАВАЛЬНІКІ ПАСТАВІМ»

У Дзяржынскім раёне працэнтаў 70 жыхароў карыстаецца прыродным газам. 3,2 тысячы кватэр і прыватных дамоў маюць газавыя калонкі. Разам з брыгадай мы выязджаем на першы адрас.

Дзверы адчыняе пенсіянерка Валянціна Станіславаўна. Прапускае нас на кухню. Спецыялісты правяраюць усё газавае абсталяванне: лічыльнік, пліту, калонку, кацёл. З дапамогай свайго прыбора вызначаюць, ці няма ўцечкі прыроднага газу. Да вентыляцыйнага канала прыкладаюць аркуш паперы: паглядзець, ці ёсць цяга (для гэтага ж можна паднесці запальнічку). Правяраюць і тэрмін прыдатнасці абсталявання. Для калонкі ён складае 12 гадоў, для пліты — 10.

— З 2009 года гэтыя кацёл і калонка стаяць, — кажа Валянціна Станіславаўна. — Засялялася сюды ў 1989-м, тады старая калонка была. Але яна столькі прастаяла, ужо дрэнна загаралася. Вось і памяняла. Скаргаў няма, дзякуй богу.

**Начальнік службы эксплуатацыі вытворчага ўпраўлення «Дзяржынскгаз» Антон ВЯЛІЧКА** адзначае, што ў 80 працэнтах дамоў у раёне ўжо паставілі новае абсталяванне:

— Старое вельмі мала дзе засталося. У асноўным на здымных кватэрах.

Пакуль ідзём па вуліцы да наступнага дома, Антон Францавіч заўважае, што пасля трагедыі ў Барысаве людзі з большым разуменнем ставяцца да візітаў газаўшчыкоў.



«Абавязкова праверце наяўнасць цягі ў дымаходзе».

— Раней прыязджаеш, кажуць: «У нас усё добра» — і не пускаюць. Цяпер такія выпадкі рэдкія.

Некаторых навіны аб загінулых ад чаднага газу напужалі. Былі выпадкі, калі людзі прасілі адключыць газавую калонку. Казалі, лепш электранагравальнікі паставяць. Іншыя ж пачалі абнаўляць газавае абсталяванне. У мясцовых будаўнічых крамах скардзяцца, што не хапае труб, якія адводзяць прадукты гарэння. Скупілі ўсё.

У наступнай кватэры, куды завітала наша праверка, сістэма таксама ў парадку.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Гаспадыня Наталля Анатольеўна калонку памяняла два з паловай гады таму.

— Перад распальваннем не забываем правяраць наяўнасць цягі, — праводзяць інструктаж спецыялісты. — Калі ў памяшканні стаіць пах газу, набіраем 104. Форткі адчыняем, электрычнасць не ўключаем і не выключаем.

## НА ЗАМЕНУ ПЛІТЫ — 30 ДЗЁН

Парушэнні падчас праверак выяўляюцца розныя. У некаторых кватэрах, напрыклад, вентыляцыйныя каналы закрываюць паперай, каб не дзьмула. Бывае, што чалавек самастойна змяняе саму канструкцыю дымахода. Дымаход высцілаюць не сталлю, а гофрай, якая выкарыстоўваецца толькі для выцяжак і вентканалаў. Яна нецеплатрывалая для прадуктаў гарэння. Але для чалавека так танней. І прасцей у мантажы. Пра бяспеку думаюць у апошнюю чаргу.

Могуць улезці ў аўтаматыку бяспекі. Газавы воданагравальнік працуе пры ціску вады ў сістэме не ніжэйшым за 50 міліметраў воднага слупа. А людзі запалкай падпіраюць кнопку для распальвання, каб калонка працавала і пры маленькім ціску.

— Некаторыя па няведанні блытаюць дымаходны і вентыляцыйны каналы, — распавядае **слесар Дзмітрый ЮШКЕВІЧ**. — Няправільна падключаюць абсталяванне. Куды бліжэй, туды і ўстаўляюць трубу ад калонкі. Так суседзяў можна атруціць.

З пачатку года ў Дзяржынскім раёне адключылі 10 газавых награвальнікаў. На 500 правераных калонак гэта няшмат, кажуць спецыялісты. Звычайна абсталяванне проста было старым.

У адной з кватэр, куды мы зайшлі, калонку таксама адключылі: зламалася аўтаматыка бяспекі. Гаспадыня, якую газаўшчыкі наведвалі яшчэ раней, паабяцала, што заменіць награвальнік у найбліжэйшы час.

— Як толькі служба сказала пра няспраўнасць, адразу замовіла калонку ў краме, — тлумачыць пенсіянерка. — Сыны сёння-заўтра прывязуць, і ўстановім.

Выязджаем на апошні адрас. У доме з разваленымі дзвярыма і смеццем паўсюль нас сустракае малады хлопец. 20-гадовы Віталій кажа, што жыве тут з дзедам і сваёй дзяўчынай.

— Пакуль нідзе не працую, шукаю месца. У ЖКГ працаваў, але там заробак не задавальняў. У сельскагаспадарчы комплекс думаю паспрабаваць уладкавацца, — на ўсякі выпадак дае справаздачу нам хлопец.

Праходзім на кухню. Калонку 1990 года выпуску тут ужо даўно адключылі.

— Колькі без гарачай вады жывём? — задумваецца Віталій. — Ну, з 2013 года, як я «хабзу» скончыў, дакладна калонка не працавала. Калі трэба, на пліце ваду грэем, у каструлях. Мыемся ў лазні ў знаёмых ці дома ў тазіках.

Пліту, праўда, цяпер таксама замяніць давядзецца. Тэрмін эксплуатацыі скончыўся. На замену даюць 30 дзён.

— З заробку куплю, — разважае Віталій. — І калонку, і пліту... Не ведаю, як разарвацца.

Суседка, якая заўважыла нас праз акно, выйшла распытаць, што тут адбываецца. І, выслухаўшы, толькі галавой пакруціла:

— П'юць яны. І самі не працуюць, і дзедаву пенсію праядаюць.



Агляд кватэры займае ўсяго 5 хвілін.




## СПЕЦЫЯЛІСТАЎ ПА РАМОНЦЕ ДЫМАХОДАЎ ХАПАЕ

**Юрый БАРАДАКА** працуе **дырэктарам Дзяржынскай газавай службы** ўжо 11 гадоў. За гэты час, кажа, не было ніводнага года, каб без парушэнняў. «Самаробкіных» хапае. Так, у адной з кватэр неяк адключылі калонку за няплату. Аварыйная служба потым прыязджае, а чалавек замест трубы веласіпедную камеру прымацаваў і далей карыстаўся газам. Адключылі з дапамогай зваркі.

Праточныя воданагравальнікі абслугоўваюцца раз на два гады, а таксама ў адпаведнасці з тэхнічным пашпартам. Калі газаўшчыкі не могуць трапіць у кватэру на працягу некалькіх дзён, то пісьмова паведамляюць гаспадарам пра дату свайго візіту. Не атрымліваецца ў чалавека ў гэты час — можна патэлефанаваць у газавую службу і дамовіцца на іншы.

Дымаходы абследуюць работнікі мясцовага ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях. Цэментныя раз на год, цагляныя — кожныя тры месяцы.

— Са шматпавярховым жылым сектарам праблем вялікіх няма. А з прыватнымі дамамі складаней, — адзначае Юрый Канстанцінавіч. — Работнікі РУНС выконваюць гэту працу па заяўках. Атрымліваецца, няма звароту ад грамадзяніна — няма наведвання дома. Трэба, каб абследаванне насіла 100-працэнтны характар. Не такі вялікі кошт гэтай паслугі — каля 40 тысяч рублёў. Жыццё даражэйшае.

Спецыялістаў, якія могуць адрамантаваць вентыляцыю ці зманціраваць новы дымаход, у раёне хапае.

— Ёсць куды звярнуцца, — запэўнівае дырэктар службы. — Але ўсе ж разумныя цяпер сталі. Абанент не тэлефануе нам, а думае, як самому зрабіць. Забіўся дымаход, напрыклад: гняздо птушынае туды можа трапіць ці цагліна. Парушаецца цяга. А чалавек бярэ адключае датчык цягі. Чаднаму газу няма куды падзецца, і ён ідзе па шляху найменшага супраціўлення: ці ў вентканал, ці ў саму кватэру.

Замяніць сапсаваную калонку для кагосьці, магчыма, дорага. Новая каштуе ад 2 да 5 мільёнаў рублёў. Але нават раённыя крамы прапаноўваюць аформіць растэрміноўку на награвальнікі. І на пліты таксама.

Наконт няшчасных выпадкаў, якія здараліся апошнім часам, у Юрыя Канстанцінавіча сваё меркаванне.

— Не кажу пра канкрэтныя сітуацыі, але не ўсе людзі думаюць пра сваю бяспеку. Газавае абсталяванне знаходзіцца ва ўласнасці чалавека. Мы толькі абслугоўваем. За два гады, пакуль мы прыйдзем з планавай праверкай, ён можа зрабіць з калонкай што заўгодна.

## ПРАВІЛЫ БЯСПЕКІ

Перад распальваннем газавага прыбора трэба забяспечыць вентыляцыю памяшкання. Адкрыць фортку, зачыніць дзверы (зазор паміж імі і падлогай павінен быць 2 сантыметры, каб быў прыток паветра). І толькі потым уключаць газавую пліту. Калі працуе выцяжка, дзверы на кухню таксама мусяць быць зачыненымі.

Кран, калі не карыстаешся плітой ці сыходзіш з дому, лепш перакрыць. Асабліва актуальная парада для маладых сем'яў, дзе дзеці могуць з цікаўнасці прыйсці і пакруціць ручкі на пліце.

Першае, на што трэба звяртаць увагу, — датчык цягі. Калі ён зламаецца, то і газавае абсталяванне не будзе працаваць. Вядома, калі людзі самі нічога не падкруцяць.

Нешта не так — тэлефануйце спецыялістам. На аварыйную заяўку, звязаную з пахам газу, брыгада прыедзе за пяць хвілін. Рамонтная (замена пліты, ліквідацыя няспраўнасцяў) выконваецца на працягу трох працоўных дзён.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*
*Дзяржынскі раён.*

■ Класныя навіны

# РОДНАЯ МОВА БУДЗЕ ГУЧАЦЬ НА ЎРОКАХ ЧАСЦЕЙ

**З наступнага навучальнага года ў пачатковай школе, пачынаючы з 2 класа, на вывучэнне беларускай і рускай моў будзе выдзяляцца аднолькавая колькасць гадзін (незалежна ад мовы навучання ва ўстанове). Пра гэта паведаміла журналістам галоўны спецыяліст упраўлення агульнай сярэдняй адукацыі Міністэрства адукацыі Ірына БУЛАЎКІНА.**

Паводле яе слоў, цяпер на вывучэнне беларускай мовы ў школах з рускай мовай навучання ў 2 класе адводзіцца дзве гадзіны, у той час як руская мова ў раскладзе другакласнікаў значыцца тры разы на тыдзень.

З наступнага навучальнага года ў малодшых школьнікаў будзе па тры ўрокі рускай і беларускай мовы і па некалькі гадзін літаратуры. Пакуль новаўвядзенне запрацуе толькі ў другім класе, але праз год — у трэцім, а потым — і ў чацвёртым. Такім чынам пачатковая школа паступова прыйдзе да аднолькавай колькасці гадзін па беларускай і рускай мовах.

— У нас дзве дзяржаўныя мовы. І калі з 5-га па 11-ты клас колькасць гадзін рускай і беларускай мовы, незалежна ад мовы навучання, аднолькавая, то чаму ў пачатковай школе яна розная? Праўда, у першым класе мы вырашылі пакінуць усё па-ранейшаму, бо там дзеткі толькі пачынаюць вывучаць грамату і вучацца чытаць, — удакладніла Ірына Булаўкіна.

Пачынаючы з 2012 года ў Міністэрстве адукацыі назіраюць рост колькасці вучняў рускамоўных школ, якія жадаюць вывучаць гісторыю і геаграфію Беларусі на беларускай мове. Напрыклад, у гэтым навучальным годзе гісторыю Беларусі на роднай мове вучаць больш за 18 тысяч школьнікаў. На думку Ірыны Булаўкінай, гэта станоўчая тэндэнцыя.

З гэтага навучальнага года вучні 10-х класаў сярэдніх школ могуць вывучаць беларускую мову і літаратуру на павышаным узроўні ў рамках профільнага навучання. У такіх класах раскладам прадугледжаны тры гадзіны на вывучэнне беларускай мовы і літаратуры ў тыдзень. З наступнага навучальнага года такая магчымасць з'явіцца адпаведна ўжо і ў адзінаццацікласнікаў.

Нагадаем, што падчас дзейнасці рабочай групы па комплексным аналізе сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь, акрамя ўвядзення аднолькавай колькасці гадзін на вывучэнне беларускай і рускай мовы ў пачатковай школе, выказваліся і іншыя прапановы па падтрымцы роднай мовы. У прыватнасці, абмяркоўвалася верагоднасць здачы абітурыентамі на ЦТ дзвюх дзяржаўных моў, таму што магчымасць выбару адной з дзяржаўных моў прывяла да таго, што беларускую мову здавалі ў апошнія гады толькі 15–20% ад агульнай колькасці абітурыентаў.

Казалі і пра тое, што неабходна вяртацца да выкладання гісторыі Беларусі і геаграфіі Беларусі на беларускай мове. Што трэба наладзіць выпуск контурных карт, атласаў і рабочых сшыткаў на дзвюх дзяржаўных мовах — беларускай і рускай...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

■ А не шкодзь!

# ВОСЬ ГЭТА «РАКІ СВІСНУЛІ»

**У Баранавічах у гандляра гэтымі членістаногімі канфіскавалі аўтамабіль.**

Гісторыя пачалася яшчэ ў верасні мінулага года. На аўтастаянцы каля Аляксееўскага рынку ў горадзе дзяржінспектары разам з супрацоўнікамі дэпартамента аховы МУС затрымалі парушальніка, які спрабаваў збыць 390 асобін рака. Ніякіх дакументаў на тавар у грамадзяніна не было.

Суд прыгаварыў гандляра-нелегала да двух гадоў пазбаўлення волі ўмоўна. У парушальніка канфіскаваны аўтамабіль, на якім ён перавозіў незаконна здабытую прадукцыю. Апроч гэтага яму давялося пакрыць і яе кошт у памеры 10,5 мільёна рублёў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# РЫМСКІЯ КАНІКУЛЫ І ЧАРНІЧНЫЯ НОЧЫ ДЛЯ ЗАКАХАНЫХ

**З не вельмі далёкіх часоў 14 лютага мы адзначаем як Дзень усіх закаханых. І ў нашай краіне гэтае свята можна ўжо лічыць традыцыйным. Як правіла, да яго рыхтуюцца загадзя: купляюць падарункі, плануюць сустрэчы. Аднак, што рабіць, калі вы яшчэ не знайшлі сваю палавінку? Альбо вам хочацца ў гэты дзень пазбегнуць людской мітусні і прадказальнага сцэнарыя? Кожны можа прыдумаць свае варыянты, але ўключыць у план прагляд фільма пра каханне будзе не лішнім. Мы прапануем вам спіс з пяці фільмаў пра каханне, знятых у розныя часы, якія добра падыдуць для дамашняга прагляду і ў кампаніі другой палавінкі, і для вечара сам-насам.**



Зусім нядаўна ў пракаце з'явіўся фільм «**Статус: свабодны**». У прэсе яго ўжо называюць «мужчынскай версіяй «Дзённіка Брыджыт Джонс». Уся гісторыя будуецца вакол адносін дзяўчыны і маладога чалавека, пасля таго як яна вырашыла разарваць адносіны. Як адзначаў рэжысёр карціны Павел Румінаў, ідэя зняць гэтую рамантычную камедыю належыць Даніле Казлоўскаму (ён жа іграе галоўнага героя і выступіў прадзюсарам фільма). Па сюжэце персанаж Казлоўскага Мікіта Калеснікаў жыве марай стаць знакамітым стэндап-комікам, а ў рэальнасці байца публічнасці. Аднак калі ад яго сыходзіць каханая дзяўчына Афіна (яе іграе Ліза Баярская), хлопец «выкідае» свае эмоцыі менавіта на публіку.

«Мы з Данілам неяк адразу вырашылі, што Афіну будзе іграць Ліза Баярская. І яна згадзілася, — узгадвае рэжысёр Румінаў. — А роля разлучніка-стаматолага дасталася Уладзіміру Селязнёву, які з'яўляецца калегам Казлоўскага па піцерскім Тэатры Еўропы. Здымкі ў нашым фільме — гэта яго дэбют у поўнаметражным кіно».

Варта адзначыць, што ў гэтым фільме Ліза Баярская зноў танцуе, і не што-небудзь, а ча-ча-ча, дзеля чаго актрыса спецыяльна займалася з выкладчыкам. А Казлоўскі ў фільме дзеля каханай робіць розныя рамантычныя ўчынкі: спявае серэнады пад вокнамі і... б'е машыну саперніка плюшавым мядзведзем. Дарэчы, здымкі сцэны з пагромам давялося адкласці на суткі, бо нечаканая ўзнікла праблема. Аказалася, што цацка мае вялікую колькасць розных металічных дэталек, і стваральнікі фільма пабаяліся, што сапраўды могуць пашкодзіць аўтамабіль. Усю ноч мядзведзя пазбаўлялі ад «металу», а потым перашывалі яго па новай... Але чаго не зробіш дзеля мастацтва!

**Самае галоўнае — не ўпусціць момант і адкрыць іншаму чалавеку тое, што ў вас на сэрцы. Памятайце, што маўчанне часам руйнуе лёсы. Як і праўда, калі вы не гатовы з ёй жыць.**

Тое ж самае і з каханнем: калі пачуцці сапраўдныя, то людзі змагаюцца за іх да апошняга. І падчас прагляду фільма «Статус: свабодны» ў гледача ёсць магчымасць паназіраць за тым, на што калі-ніколі ідуць закаханыя людзі, каб вярнуць сваю палавінку. І зразумець, што разысціся з чалавекам — гэта, магчыма, самае слушнае рашэнне ў жыцці.

Фільм «**Рымскія канікулы**» убачыў свет у 1953 годзе. Гэта прыклад кінакарціны, якая мала каго пакідае абыякавым (хоць яе і можна ўспрымаць як паштоўку з мінулага). Бо тут, па-першае, шыкоўны акцёрскі дуэт Одры Хепбёрн і Грэгары Пэка, па-другое, Рым і каханне. Менавіта пасля гэтага фільма актрыса здабыла сусветную папулярнасць. За ролю прынцэсы Ганны яна атрымала свой першы і адзіны «Оскар», хоць пасля яе яшчэ чатыры разы наміміравалі на прэстыжную ўзнагароду. Рамантычная камедыя Уільяма Уалера лічыцца адной з самых вядомых карцін пра каханне за ўсю гісторыю кінематографа. Трыма прэміямі «Оскар» і «Залатым глобусам» была адзначана гэтая праца, але галоўная яе ўзнагарода — любоў шматмільённай аўдыторыі па ўсім свеце, якая не знікае з гадамі. Тое, што фільм чорна-белы, надае яму сённяшні непаўторны шарм. У нечым «Рымскія канікулы» падобны на казку пра Папялушку, толькі наадварот — прынцэса становіцца простай дзяўчынай і пражывае суткі не па раскладзе каралеўскай асобы. Бо, згадзіцеся, не так проста жыць па распарадку дня, які не мяняўся некалькі стагоддзяў. Збег абставін і сустрэча з незнаёмцам, шпацыр з ім па горадзе стануць для гераіні магчымасцю ўбачыць сваё жыццё ў іншым «ракурсе». Зразумець, якая гэта раскоша — жыць так, як падказвае сэрца. А вось чым скончыцца рамантычная гісторыя з прыгодамі для Ганны і амерыканскага журналіста Джо, зможаце даведацца ў працэсе прагляду. І, магчыма, у чарговы раз задумаецеся, ці варта жыць, арыентуючыся на меркаванне грамадства, ці здольнае фінансавае становішча паўплываць на выбар спадарожніка жыцця... А галоўнае, ці трэба быць не самім сабой, каб адчуць сапраўднае шчасце і смак жыцця.

**13.45** «Актрыса». Маст. фільм.
**15.10** «85 гадоў з дня нараджэння пісьменніка. «Адзін дзень Жоры Уладзімава». Дак. фільм.
**15.50** Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
**16.30** «Іван Айвазоўскі». Дак. фільм.
**16.40** «Царская ложа».
**17.25** Вялікі балет.
**19.45** «85 гадоў з дня нараджэння Алы Ларыёнавай. «Больш, чым каханне».
**20.25** «Ганна на шыі». Маст. фільм.

**21.50** «Ехаў Грэка... Залатое кальцо — у пошуках сапраўднай Расіі». Дак. серыял.
**22.30** «Лінія жыцця». Юрый Бутусаў.
**23.45** Вечныя тэмы. «Гутарка з Аляксандрам Пяцігорскім». Дак. серыял.
**0.15** «Джэйн Эйр». Маст. фільм.
**1.55** «Шукальнікі». «Апошні прытулак Апостала».
**2.40** Сусветныя скарбы.

### Настальгія

**6.00** «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім. «Гісторыя рускага року». «Акварыум». Мы ніколі не станем старэйшымі». 2-я частка. 2007 год.
**6.55, 8.30, 9.40, 11.00, 12.55, 14.30, 15.40, 17.00, 18.55, 20.20, 21.40, 23.00, 0.55, 2.35, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.
**7.10** Маст. фільм «Біч Божы».
**8.50, 14.50, 20.45, 2.50** Кіначасопіс «Хачу ўсё ведаць!».
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 16.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00** «Бітламанія» з Дзмітрыем Дзіброўным. 2008 год.
**13.10** Маст. фільм «Ганна і камандор».
**18.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Лепшае. 2009 год.
**19.10** Маст. фільм «Артыст з Коханаўкі».
**22.00** «Колба часу».
**0.00** «Быў час» з Аляксандрам Палітkоўскім: «Мода па-савецку». 2006 год.
**1.10** Маст. фільм «Белая птушка з чорнай меткай».

### EuroSport 1

**3.00** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны.
**3.30** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны.
**4.00, 9.30** Веласпорт.
**5.00, 8.00, 18.45, 2.20** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
**6.00, 21.45** Watts.
**6.30, 11.30, 22.00** Снукер. Адкрыты чэмпіянат Уэлса.
**9.00** Веласпорт. Нацыянальны тур.
**10.30, 11.25** Футбол. Еўрагалы.
**10.35** Футбол. Футбол ФІФА.
**11.00** Футбол. Лаціна.
**12.15, 18.00** Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны.
**13.30, 20.45, 1.05** Веласпорт. Тур Андалусіі.
**14.30, 17.00** Лыжнае дваябор'е. Кубак свету.
**2.05** Аўта- і матаспорт.

### Камедыя

**0.40** Камедыя «Калачы».
**2.05, 14.00, 14.50, 15.40, 17.40** Скетчком «Паміж намі».
**2.20** Камедыя «Круты татачка».
**4.00** Меладрама «Красуні».
**5.40, 21.20** Камедыя «Укол парасонам».



**7.15** Камедыя «Кахаю цябе на ўсіх мовах свету».
**9.00** Меладрама «(Не)чаканы прынц».
**10.40** Камедыя «Няхай жыве Францыя!»
**12.30** Камедыя «Шэф».
**14.20, 15.10** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** Камедыя «Паўднёвыя моры».
**18.00** Камедыя «Зануда».
**19.40** Камедыя «Вясёлыя і загарэлыя».
**22.55** Меладрама «Купі, пазыч, украдзі».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.55** «Доктар І...»
**8.20, 19.00, 2.15** «Іфет». Серыял.
**10.00, 4.00** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**10.50, 4.45** «Па справах непаўналетніх». Дак. серыял.
**11.45** «Справа Астахава». Дак. серыял.
**12.40** «Жыццё як жыццё». Дак. серыял.
**13.30, 17.55** «Пятая варта». Серыял.
**14.35, 5.35** «Псіхасаматыка».
**15.10** «Нераскрытыя тайны».
**16.10** «Мой герой».
**17.00** «Белая гвардыя». Серыял.
**21.05** «Джулі і Джулія: Рыхтуем шчасце па рэцэпце». Драма.
**23.20** «Трынаццаць знакаў Задыяка».
**0.15** «Дракула». Трылер.

### ТБ1000

**6.00** Драма «1 + 1».
**8.00** Меладрама «Эрын Брakoвіч — прыгожая і рашучая».
**10.10** Камедыя «Вялікі тата».
**12.00** Драма «Маленькая жанчына».
**14.00** Драма «Мой анёл-ахоўнік».
**16.00** Драма «Язмін».
**17.45** Меладрама «Еш, маліся, кахай».
**20.00** Драма «Залатое стагоддзе».
**22.00** Драма «Таемная цяга».
**23.50** Фэнтэзі «Як злавіць монстра».
**1.30** Драма «Гангстар».
**4.00** Камедыя «Дарослая нечаканасць».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20, 16.40** Драма «Іуда».
**8.20, 2.30** Драма «Каўказская рулетка».
**10.20, 4.20** Камедыя «Прывітанне, я ваш тата!».
**12.20** Дэтэктыў «Дзесяць негрыцянят».
**14.50** Меладрама «Адзінокі па кантракце».
**18.40** Драма «Шык».
**20.20** Меладрама «Жаніх па аб'яве».
**22.20** Баявік «Танкер «Танга».
**0.30** Драма «Пахавайце мяне за плінтусам».

### National Geographic

**6.00, 13.10, 5.30** Гульні розуму.
**6.50** Займальная навука.
**7.35, 16.20, 17.55, 21.00, 0.55, 4.00** Інстынкт выжывання.
**8.20, 18.40, 21.45, 1.40, 4.50** Па слядах міфічных пачвараў.
**9.10, 14.00, 19.30** Золата ў халоднай вадзе.
**10.00, 14.45, 20.10** Верф.
**10.45** Дзікі тунец.
**11.35** Шаша праз пекла.
**12.20, 0.10, 3.15** Расследаванні авіякатастроф.
**15.30** На плітах на Юкане.
**17.05** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**22.35** Шырокі погляд.
**23.00** Навуковыя недарэчнасці.
**23.20, 2.30** Паранармальнае.

### Discovery

**8.00, 12.30** Мяцежны гараж.
**8.50, 1.00** Дынама — неверагодны ілюзіяніст.
**9.45, 14.20, 21.30** Як гэта ўстроена?
**10.10, 14.45, 21.00** Як гэта зроблена?
**10.40, 17.05** Скарбашукальнікі Амерыкі.
**11.35, 7.10** Уцёкі ад пагоні.
**13.25, 6.25** Космас навыварат.
**15.15, 5.40** Дарожныя каўбоі.
**16.10, 3.00** Махінатары.
**18.00** Паляванне на труфелі.
**19.00** Залатая ліхаманка.
**22.00** Чыгунка Аляскі.
**23.00** Аляска: апошні рубеж.
**0.00** На краі Аляскі.
**2.00, 4.50** Паляўнічыя на склады.
**4.00** Маланкавыя катастрофы.
**4.25** Сапраўдныя аферысты.

## Субота, 20 лютага

### Беларусь 1

7.20 Існасць.
**7.45 Камедыя «Дазвольце цябе пацалаваць... Зноў».**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.55 Серыял «Два бацькі і два сыны».**
**10.30** «50 рэцэптаў першага». Кулінарнае шоу.
**11.25** Лёс гігантаў.
**12.10** «Здароўе». Ток-шоу.
**13.05, 15.45 Меладрама «Красуні». 1 — 2-я серыі.**
**15.15** Краіна.
**17.30 Меладрама «Каханне як няшчасны выпадак».**
**21.00** Панарама.
**21.40 Меладрама «Была табе каханая». 1 — 4-я серыі.**
**0.50 Драма «Жывы».**
**2.25** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.05** Я хачу гэта ўбачыць!
**7.35** Беларуская кухня.
**8.00, 21.05** Тэлебарометр.
**8.05 Серыял «Мая цудоўная нянька».**



**10.10** Азбука смаку.
**10.45 Серыял «Хто ў доме гаспадар?».**
**12.45** «Бітва экстрасэнсаў. Вайна тытанаў».
**14.50** Капейка ў капейку.
**15.30** «Разбуральнікі міфаў».
**16.35 Дэтэктыў «Падмані мяне». 1-я серыя.**
**17.40 Баявік «Штурм Белага дома».**
**20.00** «Здзіві мяне». Талент-шоу.
**21.10 Баявік «Нястрымныя».**
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНА.
**22.55** Хачу ў тэлевізар!
**23.00** «Арол і Рэшка. Шопінг».
**23.55 Серыял «Як я сустрэў вашу маму».**

### Беларусь 3

**7.55, 14.45, 18.30, 0.20** «Калейдаскоп».
**8.10, 18.45 «Вечны кліч». Драма. Фільм першы.**
**9.15, 16.50 «Алхімікі». Камедыя.**
**10.55** «Спіс Кісялёва. Выратаваныя з пекла». Дак. фільм.
**11.50 «Знак бяды». Драма.**
**14.15** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**15.00** «Час кіно».
**15.05 «Смерць манекеншчыцы». Драма.**
**16.25** «Камертон». Мастак Анатоль Концуб.
**20.05** Леанід Млечын прадстаўляе. «Сусветныя тайны». «ГКЧП у жніўні сямнаццатага». Дак. фільм.
**20.45** «Калыханка».
**21.05** «Прыцягненне Альберта Вейніка». Дак. фільм.
**22.00 «Альбер Камю». Драма.**
**23.40** «Бард-парад».

### Беларусь 5

**7.45, 23.40** PRO спорт. Навіны.
**8.00** Вольная барацьба. Турнір на прызы А. Мядзведзя.
**9.35** Фрыстайл. Этап Кубка свету. Кваліфікацыя. Жанчыны.
**10.10, 23.50** Баскетбол. НБА. «Бруклін» — «Нью-Ёрк».
**11.50** Фрыстайл. Этап Кубка свету. Кваліфікацыя. Мужчыны.
**12.50** Фактар сілы.
**13.25** Піт-стоп.
**13.55** Фрыстайл. Этап Кубка свету. Мужчыны. Жанчыны. Фіналы. Цырымонія ўзнагароджання.
**15.35** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 1/16 фіналу. Агляд першых матчаў.
**16.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**17.00** Свет англійскай прэм'ер-лігі.
**17.30** Самба. Адкрыты чэмпіянат Беларусі на прызы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.
**19.30** Лёгкая атлетыка. Зімовы чэмпіянат Беларусі.
**21.35** Тэніс. Турнір WTA. Дубай. Фінал.

### АНТ

**7.00** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00, 16.00, 20.30** Нашы навіны.
**9.05** «Жыць здорава!»
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.00** «Модны прыгавор».
**11.50 Камедыя «Дачная паездка сяржанта Цыбулі».**
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Сам-насам з усімі».
**15.10** «Час пакажа».
**16.15, 21.00** Навіны спорту.
**16.20** «Ганна Герман. Дом любові і сонца».
**17.20 Камедыя «Інструкцыі не дадаюцца».**
**19.30** «Поле цудаў».
**21.05 Драма «Вялікія вочы».**
**23.05 Маст. фільм «Білет у Тамагаўк».**

### СТБ

**6.00 Драма «Гадзіннік».**
**7.50** «Анфас».
**8.05** «Тайны Чапман».
**9.00** «Разумней не прыдумаеш з Міхаілам Марфіным». «Сезон цудаў».
**10.00** «Іншая краіна». «Астравы шанцавання: што шукае Беларусь у Інданезіі».
**11.15** «Мінск і мінчане».
**11.50 «Салдаты 9». Серыял.**
**13.30, 16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**13.40, 0.45 Камедыя «Белыя росы».**
**15.20** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**15.55** «Вялікі горад».
**16.40** «Наша справа».
**16.55** «Вадзіць па-руску».
**17.35 Маст. фільм «Улада забойцы».**
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10 Драма «Жыццё цудоўнае».**
**22.15** «Дакументальны спецпраект»: «Дзень касмічных гісторый».

### МІР

**6.00 Маст. фільм «Ваенна-палявы раман».**
**7.30** «Саюзнікі».
**8.00** М/ф.
**8.30** «Медыцынская праўда».
**9.00** «Вой, мамачкі!»
**09.30** «Няма праблем».
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Зроблена ў СССР».
**10.45 Маст. фільм «Сцеражыся аўтамабіля».**
**12.30** «Цяжар абеду».
**13.00, 16.15 Серыял «Фаварыт».**
**20.55 Серыял «Па той бок ваўкоў».**
**0.50 Маст. фільм «Спіс кантактаў».**
**2.45** «Трымайся, шоубіз!»
**3.15** «Культпрасвет».
**4.00** «Дыяспары».
**4.30 Маст. фільм «Музычная гісторыя».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.35** «Пакой смеху».
**13.00** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**14.30, 20.55 Серыял «Пераезд».**
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**22.10** «Петрасян-шоу».
**23.55 Маст. фільм «Старэйшая сястра».**

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00** Сёння.
**6.10 Серыял «Сужэнцы».**
**7.10** «НашСпажыўНагляд». Не дай сябе падмануць!
**8.10** «Раніца з Юліяй Высоцкай».
**9.25** «Урачэбныя тайны плюс».
**10.20 Серыял «Святло і цень маяка».**
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.10 Серыял «Брацэнікі».**
**16.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.05** «Следства вялі...»
**19.00** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**19.55** «Новыя рускія сенсацыі».
**20.50** «Ты не паверыш!»
**21.45 Маст. фільм «Уцекачы».**
**23.25 Серыял «Марскія д'яблы. Лёсы».**

### 8 канал

**9.00, 15.50, 19.10, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**9.05** М/ф.
**9.20 Серыял «Каханне імператрыцы».**
**10.20, 10.45, 15.55, 17.25** «Хатняя крама».
**10.35** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**11.00 Прыгоды «Тайна перавалу Дзятлава».**
**12.40 Драма «Прыстанак Евы».**
**14.25** Мультпарад.
**16.00** «Адшукваецца адпачынак».
**16.30 Серыял «Альф».**
**17.35 Меладрама «Чалавек і яго сабака».**
**19.15 Дэтэктыў «Месца пад сонцам».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «Фэшн is my прафэшн».
**21.15 Трылер «Мэта нумар адзін».**

### ВТБ

**6.00, 9.30, 5.30** «Лаві момант».
**6.30** «Паспець за 24 гадзіны».
**7.30** М/ф «Пінгвіняня Пораро».
**7.45** М/ф «Смяшарыкі».
**8.00** М/ф «Маша і мядзведзь».
**8.30, 14.00** «Ералаш».
**9.00, 4.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**10.00, 1.00** «Турбаміксер».
**12.00** «Вялікая маленькая зорка».
**13.00** Рэаліці-шоу «Здаецца! З рамонтам».
**14.30, 4.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**15.10** Фэнтэзі «Прывідныя гоншчыкі 2».
**17.00** «Уральскія пельмені».
**18.30** Серыял «Як я стаў рускім».
**20.30** Баявік «Тэрмінатар 2: Судны дзень».
**23.30** «Цэнтральны мікрафон».
**0.30** Скетчком «Студэнты».
**3.30** «Дурні і дарогі».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30** Навіны культуры.
**10.20** «Ганна на шыі». Маст. фільм.
**11.40** «Больш, чым каханне». Ала Ларыёнава і Мікалай Рыбнікаў.
**12.25, 22.25** «Ехаў Грэка... Залатое кальцо — у пошуках сапраўднай Расіі». Дак. серыял.
**13.10** «Знішчальнікі». Маст. фільм.
**14.40, 2.40** Сусветныя скарбы.
**15.10** «Горад № 2 (г. Курчатаў)». Дак. фільм.
**15.50** «Больш, чым каханне». Пётр Канчалоўскі і Вольга Сурыкава.
**16.30** «Непераможны гарнізон». Дак. фільм.
**17.30** «Гарачыя дзянёчкі». Маст. фільм.
**19.00** Смеханастальгія.
**19.45** «Леанід Гайдай... і крыху пра «дыяменты». Дак. фільм.
**20.30** Вялікі балет.
**23.05** Кіно на ўсе часы. «З Афрыкі». Маст. фільм.
**1.45** «Аркадзія». М/ф для дарослых.
**1.55** «Шукальнікі». «Скарб Ванькі-Каіна».

### Настальгія

**6.00** «Бітламанія» з Дзмітрыем Дзібровым. 2008 год.
**6.55, 8.25, 9.40, 11.00, 12.40, 14.20, 15.40, 17.00, 19.20, 20.45, 23.00, 0.55, 2.35, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.
**7.10** Маст. фільм «Ганна і камандор».
**8.50, 14.50, 20.45** Кіначасопіс «Хачу ўсё ведаць!».
**9.00, 15.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Лепшае. 2009 год.
**13.10** Маст. фільм «Артыст з Коханаўкі».



**16.00** «Колба часу».
**18.00** «Зямля-Паветра». Данко. 2003 год.
**20.30** М/ф «Цудоўны званочак».
**21.00** «Быў час». 2009 год.
**22.00** Маст. фільм «Вы Пецьку не бачылі?».
**0.00** «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім. «Гісторыя рускага року». «Акварыум». Мы ніколі не станем старэйшымі». 2-я частка. 2007 год.
**1.10** Маст. фільм «Біч Божы».

### EuroSport 1

**03.30, 5.00** Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны.
**04.00, 9.30** Веласпорт. Тур Андалусіі.
**6.30** Снукер. Адкрыты чэмпіянат Уэлса.
**9.00** Веласпорт. Нацыянальны тур.
**10.30** Санны спорт. Кубак свету. Жанчыны.
**11.30, 18.15, 1.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
**12.30** Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны.
**14.15, 2.45** Лыжныя гонкі. Кубак свету.
**16.15, 17.45** Санны спорт. Кубак свету.
**17.00** Лыжнае дваябор'е. Кубак свету.
**20.15** Зімовыя віды спорту.
**21.20** Снукер. Адкрыты чэмпіянат Уэлса.

### Камедыя

**0.40** Меладрама «10 дзён каб заказаць».
**2.20** Камедыя «100 мільёнаў еўра».
**4.05** Камедыя «Калачы».
**5.40, 19.40** Камедыя «Я вярнуся да мамы».
**7.15** Камедыя «Шэф».
**8.40, 15.35, 17.35** Скетчком «Паміж намі».
**9.00** Камедыя «Паўднёвыя моры».
**10.40** Камедыя «Зануда».
**12.20** Камедыя «Вясёлыя і загарэлыя».
**14.00** Меладрама «Па прыкметах сумяшчальнасці».
**16.00** Камедыя «Укол парасонам».
**17.50** Меладрама «Купі, пазыч, украдзі».
**21.20** Камедыя «Кахаю цябе на ўсіх мовах свету».
**23.00** Меладрама «(Не)чаканы прынц».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**9.45, 5.20** «Сардэчна запрашаем дадому!»
**10.30** «Сто пытанняў даросламу».
**11.20** «Рокіно».
**11.30** «Хронікі маскоўскага побыту».
**12.20** «Доказ віны».
**12.55, 0.55** «Цудоўнае стагоддзе». Серыял.
**16.30** «Воблачна, магчымы ападкі». Анімацыйны фільм.
**17.50** «Трынаццаць знакаў Задыяка».
**18.50** «Экстрасэнсы супраць вучоных».
**20.00** «Маша і Мядзведзь». Меладрама.
**21.50** «Закладніца 2». Баявік.
**23.30** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**4.00** «Вялікія грошы. Спакуса і праклён». Дак. фільм.

### ТБ1000

**6.00** Меладрама «Апошняе каханне на Зямлі».
**8.00** Драма «Маленькая жанчыны».
**10.00** Камедыя «Сцюарт Літл».
**11.40** Меладрама «Еш, маліся, кахай».
**14.00** Фантастыка «Пасвячоны».
**16.00** Драма «Залатое стагоддзе».
**18.00** Драма «Дзіяна: Гісторыя кахання».
**20.00** Камедыя «Зводныя браты».
**21.40** Драма «Гангстар».
**0.10** Камедыя «Дарослая нечаканасць».
**1.50** Драма «Хлусня дзеля выратавання».
**3.50** Фэнтэзі «Прылады смерці: Горад касцей».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20, 18.20** Прыгоды «Яраслаў. Тысячу гадоў таму».
**8.20, 2.10** Меладрама «Жаніх па аб'яве».
**10.20, 4.10** Баявік «Танкер «Танга».
**12.40** Меладрама «Начныя забавы».
**14.40** Драма «Каўказская палетка».
**16.20** Камедыя «Прывітанне, я ваш тата!».
**20.20** Драма «Пецца па дарозе ў Царства Нябеснае».
**22.20** Меладрама «Домік у сэрцы».
**0.20** Дэтэктыў «Смяцяр».

### National Geographic

**6.00, 13.10, 17.50, 5.30** Гульні розуму.
**6.50** Займальная навука.
**7.35, 16.20** Інстынкт выжывання.
**8.20** Па слядах міфічных пачвар.
**9.10** Золата Юкана.
**10.00** Навука будучыні.
**10.45** Дзікі тунец.
**11.35** Шаша праз пекла.
**12.20, 0.10, 3.15** Расследаванні авіякатастроф.
**14.00, 17.05** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**14.45** Абаронцы культурнай спадчыны.
**15.30** На плытах па Юкане.
**18.40, 22.35** Шырокі погляд.
**19.30** Пячора гіганцкіх крышталёў.
**20.10** Ізумруд за 400 мільёнаў долараў.
**21.00, 0.55, 4.00** Карставыя варонкі.
**21.45, 1.40, 4.50** Расійскія сакрэтныя матэрыялы.
**23.00** Навуковыя недарэчнасці.
**23.20, 2.30** Паранармальнае.

### Discovery

**8.00, 15.15, 3.00, 6.25** У пагоні за класікай.
**8.50** Паляванне на труфелі.
**9.45** Чыгунка Аляскі.
**10.40, 1.00** Аляска: апошні рубеж.
**11.35, 23.00, 4.50** Ліквідатар.
**12.30** Стальныя хлопцы.
**14.20** Хуткія і гучныя.
**16.10, 5.40** З любасці да машын.
**17.05** Тэхнагеніка.
**18.00** Ашалелая рыбалка.
**22.00** Вострaў.
**2.00** Бітва з акіянам.
**4.00** На краі Аляскі.
**7.10** Як уладкаваны Сусвет.

# ШАШКІ

**выпуск №6**

Сёння нашым чытачам прапануецца бліцконкурс з 6 пазіцый двухразовага чэмпіёна Беларусі па шашачнай кампазіцыі Дзмітрыя Камчыцкага (Магілёў). Дзмітрый выйграў чэмпіянат у двух раздзелах (мініяцюры і дамачныя праблемы). Залатыя ўзнагароды 18-га чэмпіяната таксама атрымалі Пётр Шклудаў (Наваполацк) у праблемах і эцюдах, Мікалай Зайцаў (Баранавічы) у раздзеле задач, а Іван Наўроцкі (Мінск) у раздзеле па бразільскай версіі, які праводзіўся ўпершыню. На чэмпіянат 17 аўтараў прадставілі ўвогуле 282 кампазіцыі.

Бліцконкурс будзе праведзены ў два туры па тры пазіцыі ў кожным. Пераможца атрымае прыз ад аўтара кампазіцый. Сёння прапануюцца першыя тры заданні.

№3



№1
Белыя простыя: a3, a7, b6, c7, f2, h4(6).
Чорныя простыя: a5, c3, c5, d4, d8, e3, e7(7).
№2
Белыя простыя: b2, b6, d4, e5, e7, f4, f6, g7, h6(9).
Чорныя простыя: a7, c5, d2, e3, f2, g5, h4(7).
№3
Белыя простыя: d2, e1, e5, e7, f6, g5, g7(7).
Чорныя простыя: b4, b6, b8, c3, c7, d4, d8, g3(8).

Праверце свае рашэнні: Выпуск №5 ад 29.01.16.

№6 **1. hg5! h:h2 2. fg3 h:f4 3. e:g5 f:h4 4. ab4 a:c3 5. b:h8 X**

№7 **1. bc5!! d:h2 2. ab4 a:c3 3. b:h8 cd6 4. hb2 X** Першымі дакладныя адказы даслалі А. Шурпін (Івянец), Віктар і Піліп Шульга (Мінск), І. Ананіч (Гродна).

Пішыце на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, газета «Звязда», *e-mail: info@zviazda.by, або vorush@yandex.ru*

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**

# ДЗЕЦІ, ПАД'ЁМ!

## Вас чакаюць Топа і кампанія

**15 лютага маленькіх гледачоў канала «Беларусь 3» і іх бацькоў чакае сустрэча з новым «Дабраранкам». Да знакамітага мядзведзіка Топы далучаецца кампанія вясёлых сонечных зайчыкаў — Кася, Лесік і Ясік. І гэта яшчэ не ўсе сюрпрызы, падрыхтаваныя культуралагічным каналам.**

Праграма «Дабраранак» папоўніцца новымі рубрыкамі. Напрыклад, «Будзілка» дапаможа хлопчыкам і дзяўчынкам прачнуцца, далучыўшыся да музычнай энергічнай танцавальна-спартыўнай размінкі. Рубрыка «Мульціварка» рыхтуе цікавыя мультпрыгоды. «Дапамагайка» дасць карысныя парады і навучыць, як дзейнічаць у любой няпростай сітуацыі. Абаяльны беларускамоўны доктар Андрэй Вітушка падкажа, як заставацца здаровым і ніколі не губляць аптымізму. І нават строгія прадстаўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, Дзяржаўнай аўтаінспекцыі і Міністэрства ўнутраных спраў зробяць для маленькіх гледачоў выключэнне: сур'ёзныя парады загучаць не ў павучальнай, а ў забаўляльнай форме.

Культуралагічны канал запрашае прачнуцца разам з «Дабраранкам» па буднях а 7.20.




## НА СВАЮ ГАЛАВУ

Не вам казаць: «скеміць на траіх» могуць не толькі мужчыны.

Да навагодніх свят тры суседкі сярэдніх гадоў — Ніна, Зіна і Марына — надумалі падмаладзіцца. І не проста там валасы пафарбаваць, а яшчэ і прамеліраваць (выбеліць асобныя пасмачкі).

У цырульню для гэтага вырашылі не звяртацца: навошта траціць грошы на тое, што і сам можаш зрабіць? Ну сапраўды: не бязрукія ж яны, не дурныя — бачылі, як працуюць прафесіяналы... Загадзя накуплялі фарбаў. А далей...

У невялічкай місачцы змяшалі іх і прыступілі да справы. Гэта значыць, на кожную галаву «ўсклалі» спачатку па спецыяльна прадзіраўленым поліэтыленавым пакеце, потым — праз тыя дзірачкі — пасмачкамі навыцягвалі валасоў і густа напэцкалі іх фарбай з місачкі. Пасля гэтага — для паскарэння працэсу — завязалі на галовы па некалькі хусцінак і «засяклі» час. Цяпер заставалася хіба чакаць.

Але ж не толькі! У Марыны сто спраў яшчэ: гаспадарка не агледжана! Значыць, пайшла яна насіцца па двары.

А вось Ніна з Зінай — не: яны ў хаце засталіся: сядзяць, уважліва «прыслухоўваюцца», што ў іх на галовах, пад хусткамі, робіцца.

— Ой, — раптам падхапілася першая, — у мяне, здаецца, скура смыліць!

— Не прыдумляй, — супакоіла яе сяброўка. — Мне ж нічога не робіцца, значыць, і табе не павінна. Цярпі, каралевай будзеш!

Ніна паспрабавала (чаго не зробіш для прыгажосці?!), але ж цярпення ў яе хвілінкі на тры хапіла, не болей, бо галава ў яе проста «загарэлася» — сінім полымем, можна сказаць.

А таму кабета з усіх ног, з крыкам паляцела ў кухню. Мусіць, з перапуду адкруціла там кран з халоднай вадою — падсунула пад яго галаву.

Тут ужо і Зіне страшна стала — не столькі за сябе, колькі за Марыну: а яна як там? Схапіла мабільнік, спехам набрала нумар, пераблытаўшы лічбы, спытала (як высветлілася, у нейкага дзядзькі):

— Ну як ты? Галава не гарыць?

Бог ведае, што чалавек падумаў, але ж «кумпал», напэўна, абмацаў.

А Марына тым часам «тушыла» свой: ліхаманкава бегала па двары, зрывала з галавы хусцінкі, цэлафан і, здавалася, нават валасы, бо ўжо не да прыгажосці ёй было — баялася, што пасля «працэдуры» галава як тое калена стане — гладкая-гладкая.

Але ж, дзякаваць Богу, пранесла, усё абышлося. І малой крывёю, як той казаў: месцамі падпаленай скурай, месцамі — пасмамі «нежывых» валасоў.

А галоўнае, што атрымалася ў сяброўак сякое-такое меліраванне, што Новы год яны сустрэлі прыгожыя і вясёлыя! Бо, згадзіцеся, нам, жанчынам, нішто не пасуе больш, чым добры настрой і шчырая ўсмешка.

**Ф. К.,**
*г. Паставы.*

такіх «зборшчыкаў» — як правіла, з адметным колерам твару і ў бруднай вопратцы — у кожным горадзе хоць гаць гаці...

Але ж да іх Анатоль быў зусім не падобны. Ён, па-першае, увогуле не ўжываў спіртное і сачыў за сабой. Падругое, перыядычна наведваў оперныя тэатры (нават у Маскве і Ленінградзе) і потым сябрам па цэху з імпэтам расказваў пра пастаноўку «Паяцаў» альбо «Кармэн».

Грошы ж ён збіраў зусім на іншае. Не ведаю, ці праўда, але ж казалі, што вельмі падабалася яму Люся, прадавачка бачкавога піва, што ён спрабаваў заляцацца да яе. Аднак тая — не: сказала, нібыта, што будзе размаўляць з ім толькі пасля таго, як ён на кожны яе пальчык па залатым пярсцёнку надзене. Вось і стараўся чалавек — кожную капейку эканоміў, над кожнай бутэлькай дрыжаў. Я, дарэчы, сам гэта бачыў: падмяняў неяк майстра змены і падчас абходу заўважыў, што ў Анатоля фільтравальная тканіна пашкоджана.

— Трэба замяніць, а то брак пойдзе, — папярэдзіў хлопца і пайшоў сабе далей.

Вяртаюся назад, там усё па-ранейшаму: Анатоль маіх слоў як не чуў!

Чым жа, думаю, цябе застрашыць? Ага!

— Калі зараз жа не заменіш палатно, — кажу яму, — застанешся без прэміі... Сама мала — на сто бутэлек.

Пагроза тут жа спрацавала: замяніў.

Але найбольшую вядомасць гэты апаратчык займеў пазней.

Неяк пасля вячэрняй змены надумалі мужыкі выпіць: не тое ажаніўся хтось, не тое бацькам ці дзедам стаў... Факт, што віноўнік загадзя купіў гарэлкі (бо пасля 19-00 у той час не прадавалі) і схаваў яе ў гардэробе.

Поўную «тару» Анатоль, вядома ж, згледзеў, парадаваўся яшчэ: маўляў, вось яна, гатовая здабыча. Застаецца пачакаць, калі апарожняць.

Змена тым часам скончылася, а «банкета» няма і няма. «Можа, нават не будзе? Можа, нікому і не трэба тая гарэлка?» — так ці не так падумаў Анатоль, але ж факт, што выставіў з шафкі поўныя бутэлькі і змесціва іх стаў... выліваць у ракавіну.

За гэтым заняткам яго і заспелі.

Перш-наперш, вядома ж, накрычалі. І, напэўна, збілі б на горкі яблык, але ж аднаго з тых «пацярпелых» чамусьці «прабіла» на рогат. Следам — засмяяліся астатнія. Карацей — пранесла небараку.

Праўда, пасля гэтага на заводзе ў твар яго ведалі ўсе. Прыкладна, як дырэктара... Ці намесніка...

Магчыма, што гэта слава выйшла і за межы прадпрыемства — «дакацілася» да бочкі са свежым півам... Але ж як да яе паставілася Люся, я, на жаль, не ведаю.

**Мікалай СТАРЫХ,**
*г. Гомель.*

## ВЯЛІКАЯ ЛЫЖКА РОТ НЕ ДЗЯРЭ?

...Маё дзяцінства птушкай, як той казаў, праляцела ў мінулым стагоддзі і засталося ў яго далёкіх шасцідзясятых. Было яно паўгалодным, у старой сярмяжцы ды стаптаных валёнках, але з вялікімі снягамі, траскучымі маразамі і цёплай печчу, на якой так добра сядзелася-ляжалася і з якой так цікава было пазіраць, што робіцца ў хаце.

А яна, бацькоўская, у акрузе мела славу гасціннай. Ва ўсякім разе доўгімі зімовымі вечарамі менавіта да нас сыходзіліся вяскоўцы на так званыя вячоркі: рэзаліся ў карты, як малыя дзеці радаваліся, калі выйгравалі, спявалі (у майго таты быў прыгожы, высокі голас), як з перакуленай бочкі, сыпалі прымаўкамі, прыказкамі ды рознымі павучальнымі байкамі.

Тата, помню, любіў расказваць пра свае прыгоды на рацэ, пра сплаў плытоў.

Гэта была, відаць, нялёгкая праца — вымагала ад мужчын спрыту і смеласці, умення абыходзіць мелкаводдзе ды крутыя выступы берагоў. Але ж хто на што вучыўся, як той казаў: нехта кіраваў плытамі, нехта для сплаўшчыкаў гатаваў ежу.

Іхняга кухара звалі Пятрок, і адметны ён быў тым, што самы вялікі, самы лепшы кавалак рыбы заўсёды клаў сабе. Ды і юшкі наліваў не шкадуючы. Казаў: «Вялікая лыжка рот не дзярэ... Я свайму пузу не вораг».

Але ж з гэтага, як ні круці, вынікала, што ён, Пятрок, непрыяцель пузу чужому...

Карацей, дамовіліся мужыкі праўчыць свайго кашавара, загадзя размеркавалі «ролі». Пятрок згатаваў абед, раздзяліў па місках, найлепшую з іх, як заўжды, паставіў сабе ды кліча есці.

— Пачакай крыху, — за ўсіх адказвае тата. — Зараз пройдзем паварот, тады і паабедаем. А ты сюды падыдзі на мінутку — скажу нешта.

Што ён там сказаў, не так ужо і важна. Важна, што ў гэты час адзін са сплаўшчыкаў з міскі кухара адліў крыху юшкі, а вады — дабавіў: сырой, з рэчкі зачарпнуў.

Смак ад гэтага, відаць, істотна не змяніўся: сплаўшчыкі як нічога-ніякага папалуднавалі, селі адпачываць ды тым часам пазіраць на кухара. Ён спачатку спакойным быў... Потым падхапіўся, завойкаў, сказаў:

— Хлопцы, нешта мне кішкі круціць.

А сам куляю... У канец плыта.

— Што — вялікая лыжка пуза дзярэ? — смяюцца ўслед мужыкі.

Аднаму Пятру было не да смеху: усю ноч ён, бедны, спакою не меў.

Ці здагадаўся пасля гэтага аб прычыне сваёй хваробы, ніхто не ведае. Але ж высновы, здаецца, зрабіў, бо з таго дня рыбу заўжды дзяліў пароўну.

І юшку разліваў таксама: сабе — не больш.

**Галіна НІЧЫПАРОВІЧ,**
*в. Магільна, Уздзенскі раён.*

**Рубрыку вядзе**
**Валянціна ДОЎНАР.**
*dounar@zviazda.by*

***Ад яе ж. Рэзананс, так бы мовіць.*** *«...Гумар — гэта тыя ж лекі, можа, нават больш дзейсныя за таблеткі ды мікстуры, — піша спадарыня А. Балошка з Мінска. — Таму я з цікавасцю чытаю гісторыі з рубрыкі «Алё, народ на провадзе!», а вось пішу — упершыню і, можна сказаць, пад уражаннем. Аповед Мікалая Х. «Дыплом купіш, а веды?..» («Звязда», 30 студзеня), відаць, досыць тыповы? Ва ўсякім разе і на маёй памяці было нешта падобнае...*

*Такім чынам — ліхія пасляваенныя, гаспадарка разбурана, аднаўляць яе трэба, неабходных кадраў няма, ключавыя пасады займаюць людзі, далікатна кажучы, не зусім дасведчаныя.*

*Не, падчас вайны яны мужна змагаліся з ворагам, па ўсіх параметрах мелі добрыя характарыстыкі, а вось з ведамі... Не дзіва, што ў хуткім часе зверху паступіў загад: кадры любога ўзроўню павінны вучыцца. У прыватнасці, спадар Н., кіраўнік Лунінецкага аддзялення Дзяржбанка, паступае на завочнае аддзяленне Пінскага ўлікова-крэдытнага тэхнікума. Бездакорна (трэба разумець, не без дапамогі збоку) выконвае ўсе кантрольныя заданні. Але ж надыходзіць час ехаць на сесію, здаваць іспыты. Па алгебры нашаму герою дастаецца прыклад* $(a + b)^2$*... Студэнт пазіраў на яго, смачна прыпячатаў адпаведным словам і дадаў: «Колькі на свеце жыву, ніколі не бачыў, каб літара з літарай складвалася!»*

*...Як склаўся далейшы лёс гэтага кіраўніка, я не ведаю, — піша чытачка. — Хутчэй за ўсё, чалавека няма ўжо сярод жывых. А вось байка пра яго аж у новае стагоддзе сягнула! Можа, таму, што нешта падобнае, хай не такое анекдатычнае, сустракаецца і сёння?»*

*Што праўда, тое праўда. І не пісаць аб гэтым проста грэх. Да таго ж ёсць стымул: у канцы года рэдакцыя (з дапамогай чытачоў) плануе вызначыць дзясятку найлепшых баек і, цалкам магчыма, заахвоціць аўтараў.*

*Спрабуйце!*

## ШЛЯХ ДА СЭРЦА ЖАНЧЫНЫ

Захапленняў у свеце шмат, і ў кожнага яны свае. Нехта ходзіць на паляванне, нехта — на футбол. Хтосьці збірае маркі, паштоўкі, грошы, значкі... Анатоль, мой знаёмец па хімзаводзе, збіраў... пустыя бутэлькі.

Скажаце, знайшоў чым здзівіць:

■ Неасабісты суб'ектыў



# ІХНЯЯ КРЭПАСЦЬ

### Пра касу, казу і пра тое, што можна супрацьпаставіць вясковым рабаўнікам

Пад раніцу, калі амаль усе жыхары вялікай палескай вёскі Бастынь яшчэ спалі, туды заглянула смерць. Ну, калі не яна сама, дык яе памагатыя, бо галоўны атрыбут кастлявай — каса — у іх дакладна быў і выкарыстаць яны збіраліся яго «па назначэнні»... Ніякай містыкі і цемрашальства, у Бастыні літаральна пазаўчора разыгралася драма, якая толькі цудам не стала сапраўднай трагедыяй. У хату да адзінокай пажылой жанчыны залезлі рабаўнікі. Лезлі ў лютаўскай цемры, у чатыры гадзіны раніцы не красці — менавіта рабаваць. Выставілі акно ў верандзе, выцягнулі з ложка і збілі 76-гадовую гаспадыню, звязалі яе скотчам, прыставілі да шыі касу. Абяцалі зарэзаць, калі не аддасць грошы. Калі ж зразумелі, што ўзяць у бабулі няма чаго, хуценька зніклі. Ведалі: трэба замятаць сляды, бо зловяць.

Праўда, іх усё адно злавілі. У той жа дзень, у Клецкім раёне, куды паспелі даехаць з Лунінецкага. Высветлілася: сапраўдная міжрэгіянальная і стракатая, бы зграя бяздомных сабак, хеўра: 67-гадовы пенсіянер, 45-гадовы і 28-гадовы шукальнікі прыгод, 53-гадовы былы «зэк». Першых трох занесла на Брэстчыну ажно з Ашмянскага раёна Гродзенскай вобласці, апошняму было крыху бліжэй — ён з прысталічнага Дзяржынска. Бандыцкі рыштунак — каса (не выключана, што таксама сцягнутая з якога вясковага хлева) — быў пры іх.

Трэба спадзявацца, яны атрымаюць тое, што заслужылі. І нават больш. Бо апісанае вышэй — усяго толькі адвольны пераказ міліцэйскай зводкі. Пра чалавечы жах і бездапаможнасць, якія адчувала тая бабуля, у пратаколах не напісана. Як і пра тое, колькі бяссонных начэй яна яшчэ правядзе, колькі літраў валяр'янкі вып'е, ці забудзецца калі пра гэты начны кашмар, ці зможа ўвогуле яго забыць за той час, што адмераны ёй яшчэ на зямлі...

Алітаральна напярэдадні прыйшла вестка з нашага навакольля. Для староннняга назіральніка выпадак хутчэй камічны, чым драматычны, але, як кажуць, на тую ж тэму. Пенсіянеры з аддаленай ад сельсавета і цэнтральнай сядзібы калгаса вёскі трымаюць яшчэ моцную гаспадарку, балазе, удваіх жывуць і здароўе дазваляе. Вырашылі яны прадаць казу, пра што і далі аб'яву ў мясцовай раёнцы. Пакупнік з'явіўся хутка. Прыехаў на машыне, папрасіў гаспадароў завесці яго ў хлеў: трэба, маўляў, паглядзець, у якіх умовах скаціна гадавалася, дый з самой казой бліжэй «пазнаёміцца». Гаспадарлівыя сужэнцы — людзі не толькі заможныя, але і асцярожныя, таму ў хлеў з незнаёмцам пайшлі ўдваіх, абачліва замкнуўшы хату. Каза патэнцыяльнаму гаспадару спадабалася, але тут неспадзявана ў яго зазваніў мабільны — тэрмінова выклікалі на працу. Пашкадаваўшы, што так атрымалася, паабяцаўшы абавязкова вярнуцца, ён скочыў у сваё аўто і хуценька з'ехаў. Старыя толькі паспелі заўважыць што ў машыне быў яшчэ нехта, хоць прыехаў той дзядзька адзін. Пацiснулі плячыма: можа, падалося? ды пайшлі хату адмыкаць.

Аказалася, не падалося. На ложку, што стаяў ля акна, на чысцюткай капе быў адціснуты свежы след вялікага бота. Прыгледзеліся: у шыбе (у новым пластыкавым шклопакеце!) акуратна выразаная дзірачка, можна, прасунуўшы руку, лёгка акно адчыніць і гэтаксама зачыніць. Кінуліся глядзець, ці цэлыя грошы, ужо амаль ведаючы адказ. З'ехалі зберажэнні ў невядомым напрамку разам з аматарамі дробнай рагатай жывёлы... Але ўсё б магло скончыцца значна горш, калі б хто са старых заўважыў злодзея, калі б яшчэ не вылез з хаты.

Цяпер зладзеяў шукаюць. І абавязкова знойдуць: пападуцца калі не цяпер, дык на нейкай іншай «справе». Але на іх месца прыйдуць новыя. Іх не спалохае тое, што міліцыя ўсё роўна зловіць. (Ведаю ад знаёмых міліцыянераў, што злачынцаў, якія крыўдзяць пажылых людзей, шукаюць асабліва заўзята, бо бачаць у пакрыўджаных сваіх састарэлых бацькоў.) Але ахвотнікі да лёгкай нажывы будуць рызыкаваць, бо занадта вялікая спакуса — нашы адзінокія безабаронныя старыя, што жывуць у далёкіх вёсках.

Як абараніць іх, тых, хто ў сваёй упартай прывязанасці да роднай хаты не хоча ехаць да дзяцей у горад, ці тых, хто па волі лёсу вымушаны дажываць у адзіноце? Абараніць менавіта ад зламыснікаў, якія могуць з імі расправіцца фізічна, — ад рабаўнікоў і бандытаў (а і тым, і другім у адзін міг можа зрабіцца вясковы п'яніца, якому не хапае на дабаўку).

З махлярамі, што падманам забіраюць у старых грошы, працэй: часцей нагадваць нашым пенсіянерам аб падобнай небяспецы. І галоўнае — не пакідаць іх у самоце, калі бабуля ці дзед радуюцца любой жывой душы, што зайшла ў хату, тэлефанаваць як мага часцей, прыязджаць, ніглядзячы на проста жудасную занятасць. А вось ад людзей з касой абароніць, як ні трывіальна гучыць, высокі плот, надзейныя вокны і дзверы, добра калі яшчэ злосны сабака будзе бегаць па двары.

Але ці спяшаемся мы рабіць на родным падворку такі капітальны рамонт? Тут яшчэ і старыя, канешне, дапамагаюць: маўляў, колькі мне тут засталося, навошта грошы траціць. І мы пагаджаемся. (А пасля, калі родныя людзі сыходзяць у нябыт, хуценька на ўжо СВАЁЙ ДАЧЫ ставім металічныя дзверы, шклопакеты і плот з металапрофілю — высозны, што вуліцы з вокнаў не відаць...)

Наша суседка, калі яе маці і цётка прынялі рашэнне вярнуцца з горада ў бацькоўскую хату ў вёсцы, да справы падышла сур'ёзна. Перш чым дазволіць ім пераехаць, падсыпала вышэйшы падмурак, паставіла новыя дыхтоўныя вокны, з усіх бакоў абгарадзіла двор густым плотам. Жалезныя вароты зачыняюцца знутры, а на глухой сцяне хаты вісіць ліхтар. «Зрабіла бабам крэпасць», — з'едліва жартавалі аднавяскоўцы.

Цяпер, пэўна, зайздросцяць: казу зладзеі «куплялі» ў вёсцы, да якой нейкія два кіламетры.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**
*alena@zviazda.by*

# Извещение о проведении 28 марта 2016 года открытого аукциона по продаже имущества ИЗАО «Евротрансэнерго»

ПРЕДМЕТ АУКЦИОНА

| Лот №1 |
|---|
| Незавершенное законсервированное капитальное строение «Газопровод-отвод ГРС Брест-2-Государственная граница Республики Польша» (инвентарный номер 100/U-82869). Общая протяженность 453,7 м. Газопровод состоит из двух ниток (основная и резервная) и трубопровода телефонной канализации. Протяженность основной нитки на территории Республики Беларусь – 151,9 м, резервной нитки – 157,8 м. Протяженность трубопровода телефонной канализации – 144 м. Земельного участка не занимает, так как объект расположен под землей.<br>Местонахождение – Республика Беларусь, Брестская обл., Брестский район, Клейниковский с/с, 1,9 км южней д. Непли.<br>Начальная цена – 23 773 064 328 белорусских рублей с учетом НДС по ставке 20%.<br>Сумма задатка – 50 000 000 белорусских рублей.<br>Обременение – нет |
| **Лот №2** |
| Герметизирующая резиновая манжета ПМТД 273 – 2 шт.<br>Начальная цена – 30 196 500 белорусских рублей с учетом НДС по ставке 20%.<br>Сумма задатка – 1 000 000 белорусских рублей.<br>Обременение – нет |
| **Лот №3** |
| Кольцо опорно-направляющее ПМТД 273 – 149 шт.<br>Начальная цена – 613 000 000 белорусских рублей с учетом НДС по ставке 20%.<br>Сумма задатка – 6 000 000 белорусских рублей.<br>Обременение – нет |
| **Лот №4** |
| Оголовок для трубопровода ПМТД 273 – 1 шт.<br>Начальная цена – 10 000 000 белорусских рублей с учетом НДС по ставке 20%.<br>Сумма задатка – 1 000 000 белорусских рублей.<br>Обременение – нет |

**Продавец (собственник) имущества – ИЗАО «Евротрансэнерго», 220007, г. Минск, ул. Володько, д. 18, к. 212-А, телефон (017) 222 03 19.**
**Организатор аукциона – ИЗАО «Евротрансэнерго», 220007, г. Минск, ул. Володько, д. 18, к. 212-А, телефон (017) 222 03 19.**

Условие аукциона – победитель аукциона (покупатель) возмещает организатору аукциона фактические затраты на организацию и проведение результативного аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. Аукцион проводится в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ИЗАО «Евротрансэнерго», утвержденным организатором аукциона. К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором аукциона о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету аукциона, а также представившие организатору аукциона следующие документы: заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором аукциона); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет ИЗАО «Евротрансэнерго» № 3012006746018 в «Приорбанк» ОАО г. Минск, ЦБУ 113, код 153001749, УНП 190475731 не позднее окончания срока приема документов на участие в аукционе.* В платежном поручении в графе «Назначение платежа» указывать: «Задаток для участия в аукционе по лоту №__ согласно Условиям проведения аукциона от 11.02.2016 с НДС».

Торги проходят в форме открытого аукциона с применением метода понижения начальной цены. Шаг аукциона на понижение – 15 (пятнадцать процентов) от начальной цены Лота. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена понижается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет аукциона. Данный участник объявляется победителем аукциона, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона и включает НДС. Цена продажи не может быть менее минимальной цены, установленной собственником имущества перед проведением аукциона. В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Договор купли-продажи между продавцом и победителем аукциона (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы возмещения фактических затрат по организации и проведению аукциона и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС производится в течение 30 (тридцати) банковских дней с момента заключения договора купли-продажи по результатам аукциона.

**Аукцион проводится 28 марта 2016 года в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Володько, д. 18, к. 212-А.**

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **по 27.03.2016 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. Володько, д. 18, к. 212-А.

**Телефон для справок:**
**(017) 222 03 19 (ИЗАО «Евротрансэнерго»).**

---

17 марта 2016 года в 12.00 состоится очередное общее собрание акционеров «ОАО «Татьяна».

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Итоги финансово-хозяйственной деятельности общества за 2015 год и основные направления деятельности общества в 2016 году.
2. Отчет наблюдательного совета общества.
3. Утверждение годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности общества за 2015 год.
4. О выплате дивидендов и утверждение распределения прибыли и убытков общества за 2015 год.
5. Утверждение основных направлений использования прибыли в 2016 году и первом квартале 2017 года.
6. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии общества.
7. О материальном вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии общества.

Место нахождения ОАО «Татьяна»: г. Гомель, ул. Академика Павлова, 26.

Место проведения собрания: г. Гомель, ул. Академика Павлова, 26.

Время регистрации участников собрания в день проведения собрания с 11.30 до 12.00 по предъявлении документа, удостоверяющего личность (для представителя акционера – доверенность).

Акционеры могут ознакомиться с материалами по вопросам повестки дня собрания в рабочие дни с 11.00 до 13.00, начиная с 26.02.2016 г.,по месту нахождения общества.

Наблюдательный совет.

УНП 400068248

---

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** | | |
|---|---|---|---|
| Продавец | **Государственное предприятие «Институт НИИСМ», г. Минск, ул. Минина, 23, тел. (017) 222-97-10, факс (017) 226-26-60** | | |
| **Предмет аукциона** | | | |
| **Лот №1** | | | |
| **Марка, модель** | **Тип ТС** | **Год выпуска** | **Инвентарный номер** |
| **ГАЗ 31105** (бензин, 2400 см$^3$) | Легковой седан | 2004 | 00000181 |
| **Начальная цена с НДС 20% – 19 756 548 белорусских рублей** | | | |
| **Лот №2** | | | |
| **Chevrolet Niva** (бензин, 1700 см$^3$) | Легковой джип | 2005 | 1150 |
| **Начальная цена с НДС 20% – 46 735 920 белорусских рублей** | | | |
| **Лот №3** | | | |
| **МАЗ 6312А8** (дизель, 400 л.с.) | Грузовой фургон тентовый | 2008 | 01050008 |
| **Начальная цена с НДС 20% – 223 057 800 белорусских рублей** | | | |
| **Лот №4** | | | |
| **П САЗ 8317** | Прицеп | 1999 | 01050002 |
| **Начальная цена с НДС 20% – 4 673 592 белорусских рубля** | | | |
| **Лот №5** | | | |
| **Станок горизонтальный консольно-фрезерный 6М52Г** | | 1961 | 6630 |
| **Дополнительная информация:** завод-изготовитель: «Завод фрезерных станков г. Горький»; длина – 2260 мм; ширина – 1745 мм; высота – 1660 мм; вес – 2700 кг; размер рабочей поверхности стола (длина/ширина), 1250/320 мм | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 10 440 000 белорусских рублей** | | | |
| **Место нахождения предмета торгов** | **ГП «Институт НИИСМ», г. Минск, ул. Минина, 23** | | |
| **Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона (лота) в белорусских рублях (BYR) перечисляется на р/с № 3012343260010 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739 | | | |
| **Порядок проведения торгов,** оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также информация о порядке и сроках возмещения затрат на организацию и проведение торгов указаны в условиях проведения торгов, определенных в Положении о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12 июля 2013 г. № 609, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.** Организатор торгов имеет право отказаться от их проведения в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 5** рабочих дней после проведения аукциона | | | |
| **Срок оплаты предмета аукциона: 30 календарных дней** после заключения договора купли-продажи | | | |
| **Дата и время проведения аукциона** | **15.03.2016 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | |
| **Дата и время окончания приема документов и внесения задатка** | **14.03.2016 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | |
| **Контактные телефоны** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71. E-mail: auction@cpo.by** | | |

---

23 февраля 2016 г. в 10.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Лорри-Сервис».

Повестка дня:

1. О реорганизации ОАО «Лорри-Сервис».

Местонахождение ОАО «Лорри-Сервис»: г. Брест, ул. Дубровская, 36.

Место проведения собрания: г. Брест, ул. Дубровская, 36.

Время регистрации в день проведения собрания с 09.30 до 10.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

